*Жніва* ☞ 3




# Ніва

**ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ**

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714




*Адкрытае Падляшша* ☞ 9


http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 33 (2779) Год LIV | Беласток, 16 жніўня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)


*XXV Свята беларускай культуры*

## Пашану роднаму слову і таленту

Міра ЛУКША

Юбілейнае, ужо дваццаць пятае Свята беларускай культуры, арганізаванае Беларускім грамадска-культурным таварыствам, сабрала ў Звярынецкім парку ў Беластоку ў нядзелю, 9 жніўня, у пасляабедні час тысячы аматараў роднай культуры. Перш за ўсё свойскіх спеваў, якія тры гадзіны лунaлі сярод карабельных сосен ціхага закутка Беластока. Шкада, што нельга было пахваліцца гэтым скарбам крыху за трыста метраў ад гэтага прыемнага і ўтульнага месца — на толькі што адкрытым аграмадным Гарадскім пляцы вакол ратушы на Рынку Касцюшкі пасярод Беластока, пра „шматкультурнасць" якога пры кожнай нагодзе гавораць улады і хваляцца гэтым перад усім светам. На свяце былі прысутныя таксама і ўладныя асобы з нашага асяроддзя — можна хіба будзе мець надзею, што наступныя шматлюдныя беларускія мерапрыемствы паказаны будуць з гонарам якраз там. І збяруць яны яшчэ большыя тлумы людзей, не толькі сваякоў, зацікаўленых беларускімі песняй і словам.



Фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

*Па-майстэрску выступае зусім не „аматарская" „Церніца"*

У мерапрыемстве прынялі ўдзел улады Беластока, прадстаўнікі міністэрстваў Польшчы і Беларусі — адміністрацыі, замежных спраў, адукацыі, пасольства Беларусі ў Польшчы, Генеральнага консульства РБ у Беластоку, Гродзенскага аблвыканкама, павятовых і гмінных улад Падляшша. Сёлетняе свята культуры падтрымалі: Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі РП, маршалак Падляшскага ваяводства, прэзідэнт горада Беластока, пасольства Рэспублікі Беларусь і Культурны цэнтр Беларусі. Зачытаны былі віншавальныя лісты, між іншым, міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі РП, упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леаніда Гулякі ды міністра культуры Рэспублікі Беларусь, які яшчэ год таму прысутнічаў на Свяце як пасол РБ у Польшчы. Асабліва словы міністра Паўла Латушкі, зачытаныя старшынёй ГП БГКТ Янам Сычэўскім, выклікалі бурныя апладысменты гледачоў: „Шаноўныя сябры! Ад усёй душы віншую арганізатараў, удзельнікаў і гасцей Свята беларускай культуры. Віншую вас з гэтай яскравай падзеяй, якая стала традыцыйнай і жаданай для беларусаў Польшчы. Я неаднойчы меў вялікі гонар быць разам з вамі на гэтым цудоўным свяце, радавацца прыгожым беларускім спевам, з пашанай роднаму слову і таленту народных артыстаў. Дзякую кожнаму з вас за шчодры талент і любоў, і павагу да беларускай спадчыны. Няхай свята беларускай культуры доўгія гады будзе сапраўдным упрыгожаннем Беласточчыны і яшчэ адным прыступкам ва ўмацаванні сяброўства паміж беларусамі і палякамі".

Пад музыку выступленняў са сцэ-



Фота Міры ЛУКШЫ

*І спелыя, і маленькія творцы роднай культуры*

ны, якія вялі Бася Кендысь і Арэк Якімюк, можна было пацікавіцца вырабамі народных умельцаў з Беласточчыны і Гродзеншчыны. З Гродна прывезлі свае працы па жывапісе, саломапляценні, ганчарстве, ткацтве, між іншым, Валянціна Брысач, Валянціна Цыганок, Лідзія Шпектарава, Таццяна Шыбіна, Таццяна Пярвухіна, Люба Блохава, Анна Маліноўская; з Беласточчыны — вядомая дзяячка культуры з Гарадка нястомная Ніна Цыванюк. Побач з імі са сваімі кнігамі сядзелі нашы майстры слова розных пакаленняў — Ян Чыквін, Галіна Тварановіч, Юрый Баена, Юрка Буйнюк, Васіль Петручук, Віктар Швед, таксама народны паэт са Станцыі Валілы Анатоль Парэмбскі. Ян Заброцкі з Цэнтра славянскай культуры ў Варшаве, як штогод, прапанаваў вялікі выбар кніг пра славяншчыну і праваслаўе: „На жаль, наш цэнтр перастаў ужо быць „цэнтрам кнігі і прэсы"; народ штораз менш цікавіцца кнігай, асабліва беларускай. Мы прынцыпова прывозім свае кнігі на беларускія святы дзеля падтрымкі роднай культуры". Зацікаўленне іншай культурай чым песенная на свяце было незалішняе, але не было часу аддавацца тужлівым роздумам руплівым працаўнікам на літаратурных гонях. На эстрадзе тры гадзіны ў хуткім тэмпе віўся каляровы веер выступоўцаў. Пачаў Марк Скамароўскі з Падляшскай капэлай з Сямятыч са сваім гітам, прагучаўшым ва ўсёй Польшчы — „Колькі ў небе зор", а за ім — ад маленькіх да старэнькіх, пачынаючы ад дашкольнікаў-лаўрэатаў песенных конкурсаў Юлькі Іванюк і Дамінікі Казлюк з садка № 14 у Беластоку. Выступілі гурты „Сказка" і „Вясна" з Беластока, танцавальны ансамбль „Перапёлка" з Гайнаўскага дома культуры, Юліта Ваўрашук, Марлена Бяглюк і Паўліна Нікалаюк ды Наталля Амельянюк таксама з ГДК, Магдаліна і Дар'я Маліш з Орлі, маладзенькія „Заранaчка" і „Рамонка" з Ласінкі, „Чыжавяне" з Чыжоў, „Расспяваны Гарадок", „Рэха Пушчы" з Гайнаўкі, „Арэшкі" з Арэшкава, „Арт-Пронар" з Нарвы, „Згодныя макі" з Райска, хор „Крыніца" і гурт „Лайланд" з Беластока, „Цаглінкі" са Старога Ляўкова. „Калінкі" (з Гарадка?) не было. Зоркай на свяце быў заслужаны для беларускай культуры аматарскі ансамбль беларускай песні Мінскага палаца культуры і спорту чыгуначнікаў „Церніца" з Мінска. Як сказаў старшыня БГКТ Ян Сычэўскі, беларуская культура гэта найважнейшая каштоўнасць у жыцці кожнага беларуса на Беласточчыне, а свята гэтай культуры з'яўляецца нагодай да прэзентацыі мастацкіх здабыткаў.

### *Істэрыя*

☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Над Грузіяй пранёсся смерч. Як перадалі тэлевізійныя навіны, ён быў кароткі, але вельмі моцны і разбуральны. Зараз грузіны падлічваюць выдаткі, ліквідоўваюць наступствы катастрофы, адбудоўваюць разбуранае.

А вось над Расіяй грузінскі смерч не знікае. Нават сам Мядзведзеў, які намінальна лічыцца прэзідэнтам Расіі, некалькі дзён запар не вылазіў з блакітных экранаў расійскіх тэлеканалаў...

### *Кніжка пра падманную сілу выдумкі*

☞ 2

Ганна КАНДРАЦЮК

Доўгі час здзіўлялася я сабе самой, бо пры адсутнасці дзеяння „Сароку на шыбеніцы" хацелася дачытаць да канца. І не ішло тут пра сам канец; ён — значыць смерць галоўнай гераіні — абвешчаны ўжо ў пачатку рамана. Магчыма, я разлічвала на хібы і слабыя бакі кніжкі, каб папікнуць аўтара...

### *Прэзентацыя народных песень і вырабаў*

☞ 5

Аляксей МАРОЗ



### *Майсеневы прапановы*

☞ 8

Віктар БУРА



### *Гайнаўскі рок-н-рол*

☞ 12

Ілона КАРПЮК





# Істэрыя

*Над Грузіяй пранёсся смерч. Як перадалі тэлевізійныя навіны, ён быў кароткі, але вельмі моцны і разбуральны. Зараз грузіны падлічваюць выдаткі, ліквідоўваюць наступствы катастрофы, адбудоўваюць разбуранае.*

*А вось над Расіяй грузінскі смерч не знікае. Нават сам Мядзведзеў, які намінальна лічыцца прэзідэнтам Расіі, некалькі дзён запар не вылазіў з блакітных экранаў расійскіх тэлеканалаў, каб „патрыятызаваць" на тэму расійска-грузінскай вайны, у гонар гадавіны ваеннай перамогі Пуціна над Саакашвілі. І „патрыятызаваў" аж да нейкай ненармальнай, апантана-маніякальнай істэрыі. Сцвярджаў, што Расія ўстала з каленяў і прымусіць увесь свет з ёй лічыцца. Хто і калі паставіў Расію на калені і хто з ёй зараз не лічыцца пераемнік Пуціна не канкрэтызаваў.*

*Яго словы і выказванні іншых расійскіх палітыкаў многіх людзей моцна напалохалі. Сталі нават з'яўляцца паведамленні, што Расія зноў увядзе свае войскі ў Грузію і будзе ваяваць да тае пары, пакуль не наваюецца, ці хаця б пакуль не знішчыць галоўнага грузіна. Ды і падставы для такіх падазрэнняў сур'ёзныя. Расійскія ваенныя сталі казаць, што грузіны пачалі абстрэльваць Абхазію і Паўднёвую Асецію ды яшчэ блокпасты расійскіх міратворцаў. Усё дакладна як год таму, калі гэтая вайна і пачалася.*

*Ды калі пакапацца ў расійскай гісторыі тых часоў, калі расійскі народ быў у палоне такіх улад як зараз, і ў палоне тых рэжымаў, якімі ганарыцца сённяшні, то становіцца відавочным той факт, што вайна і агрэсія з'яўляецца неад'емным фактарам іх палітыкі. Гэта самая сутнасць такіх рэжымаў. І самае галоўнае, каб было пабольш ахвяр. Пабольш чужых ахвяр, але найперш пабольш сваіх забітых і пакалечаных.*

*Рэальную колькасць загінуўшых яны ніколі не лічылі. Гаварылі так прыблізна, акругляючы да дзесяткаў мільёнаў. І чым больш было забітых, тым большы гонар быў для кіраўнікоў краіны. Яны не саромеліся таго, што людзі гінуць з-за іх нядбайнага кіраўніцтва, няўдалага як дыпламатычнага кіравання да вайны, так і вайсковага падчас яе. Наадварот, яны хваліліся колькасцю загінуўшых, можна сказаць ганарыліся, падаючы гэта як сваю асабістую ахвяру.*

*Вось і пасля расійска-грузінскай вайны прайшоў цэлы год, а рэальная колькасць загінуўшых не названая. То столькі кажуць, то два разы столькі. Замежныя эксперты перакананыя, што праўду пра загінуўшых хаваюць. Але гэта памылка, бо праўды не сказалі б, каб ведалі. Але ўвесь абсурд сённяшняга дня ў тым, што гэтага ніхто не ведае, бо ніхто не лічыў тых загінуўшых і лічыць не збіраўся. Гэта ўвогуле нікога з расійскага ваеннага і дзяржаўнага кіраўніцтва не цікавіць. Ім толькі шкада, што загінула менш мільёна. Ну што гэта за вайна з удзелам самой вялікай Расіі, калі рускіх загінула менш мільёна. Вось і з'яўляюцца ў галовах ваякаў і палітыкаў думкі, што трэба яе зноў пачаць, і працягваць да тае пары, пакуль колькасць ахвяр не будзе адпавядаць нацыянальнаму гонару вялікаросаў.*

*Праўда, Мядзведзеў пра пачатак новай вайны не казаў напрамую. Ён выкарыстаў правераную сталінскую рыторыку пра тое, што Расія гатова даць адпор любому агрэсару. І яго шавіністычныя прамовы неабавязкова абазначаюць новую вайну. Проста расійскаму кіраўніцтву няма больш чым пахваліцца перад сваім народам і астатнім светам, акрамя як перамогай вялікай Расіі над маленькай Грузіяй, бо раней увесь час хваліліся перамогай над гітлераўскай Германіяй. Але зашмат часу прайшло з тае пары і безліч прайграных войнаў, ад афганскай да чачэнскай. А тут такая нагода ўсяліць шавінізм у расійскі народ і тым самым апраўдаць нягегласць свайго кіраўніцтва і неабходнасць існавання ў Расіі таталітарнай улады. Гэта значыць саміх сябе.*

*Для рускіх людзей гэта значыць, што ўлада не збіраецца ганарыцца уздымам дабрабыту ў Расіі, а значыць і не збіраецца усё што-небудзь рабіць для гэтага. А для суседзяў Расіі гэта значыць, што расійскія танкі могуць у любы час з'явіцца на іх тэрыторыі. Можа ў Грузіі, можа на Украіне, а можа і ў братняй Беларусі.*

**Віктар САЗОНАЎ**

# Кніжка пра падманную сілу выдумкі



***Альгерд Бахарэвіч, Сарока на шыбеніцы, Менск 2009, выдавец: І. П. Логінаў (раман, 353 стар.).***

*Доўгі час здзіўлялася я сабе самой, бо пры адсутнасці дзеяння „Сароку на шыбеніцы" хацелася дачытаць да канца. І не ішло тут пра сам канец; ён — значыць смерць галоўнай гераіні — абвешчаны ўжо ў пачатку рамана. Магчыма, я разлічвала на хібы і слабыя бакі кніжкі, каб папікнуць аўтара. Мне не падабалася цягнуць „пра нішто", але вабіла жывая, пластычная фраза, гумар, інтэлектуальны пераклік з сусветнымі творамі мастацтва, натуральная беларушчына. У рэшце рэшт я перастала дашуквацца сэнсаў і, як удзельніца камп'ютарнай гульні, стала хвалявацца разам з Веранікай, галоўным персанажам, за нішто. Разам з ёй я асуджала яе прыдуманыя экстрэмчыкі з усякімі вычварэнствамі, жахамі, дурнымі спадзяваннямі. Паразы ў віртуальным свеце здаваліся важнейшымі за рэальныя (жыццёвыя хібы і абмежаванні гераіні не хвалявалі так моцна; яны былі настолькі безнадзейныя, што ад пачатку здаваліся пройгрышнымі).*

*Альгерд Бахарэвіч настолькі кпіць з танных містыцызмаў вакол смерці (асабліва Паўлы Каэльё і яго рамана „Вераніка вырашае памерці"), што чытач атрымлівае палёгку ад шчаслівага заканчэння, значыць, ад трагічнага сканання гераіні. У яе безнадзейным становішчы смерць явіцца ласкай лёсу. Вераніка згіне з рук мсціўца-апазіцыянера, які, з-пад зямлі, урываецца ў кабінет і пазначыць яе смерць пафасам. Чытачу зразумела, што ў такіх абставінах пахаваюць Вераніку з належнай пашанай, на кошт установы, бацькі атрымаюць належную страхоўку. Словам, усё будзе ОК!*

*Смерць, асабліва калі ідзе пра камп'ютарныя гульні, не найгоршы выхад. Ад пачатку рамана Веранікі падрыхтаваны больш подлы сцэнарый. Яе хочуць знішчыць у яе літаратурна-рэальным жыцці сябры-супрацоўнікі. На баку крывадушных кар'ерыстаў і Ён — каханне і сэнс жыцця Веранікі. (Гэта дзеля Яго яна пусцілася ў сабачую скуру, карацей, паступіла на працу ў адміністрацыю ўправы канцлагераў). Чытач таксама не хоча сапраўднага сутыкнення з рэчаіснасцю. Не хоча думаць, што станецца з Веранікай, калі яе пагоняць з прэстыжнай пасады. Як паставіцца да яе мамаша, якая шчасце сям'і бачыць у адным прызнаку: каб кожны дзень на стале было мяса. Як успрыме паразу бацька-алкаш (зашыты), што бавіць час як слімак на канапе ля тэліка. Як абароніць яе Лёнька, з якім Вераніка бавіць час ад нуды і ў надзеі, што пазнаёміцца з некім цікавейшым за Лёньку. І галоўнае — што ў такой млоснажаласнай сітуацыі прыдумае яшчэ аўтар...*




*Альгерд Бахарэвіч, хоць прызнаецца ў таленце да заікання, першакласны апавядальнік. З дапамогай віртуальшчыны (між іншым апісання камп'ютарных гульняў) сцягвае беларускую прозу на зямлю. Хоць аўтар рэальна жыве ў Гамбургу, прыемна з ім перамяшчацца на аўтобусах вуліцамі Менска, разам заглядаць у цеснаватыя кватэры і пакоі герояў, асуджаць іх непрыстойнасць і адначасова любіць за нармальнасць. Аўтар мае паклоннікаў сярод (асабліва маладых) немцаў, яго „Сарока на шыбеніцы" неўзабаве выйдзе ў перакладзе Томаса Вайдэра на нямецкую мову.*

**Ганна КАНДРАЦЮК**

## Вачыма еўрапейца

# Уяўны цуд



*Як, мабыць, ужо вам усім вядома, швейцарскі фонд „New 7 Wonders of Nature" аб'явіў спісак 28 кандыдатаў, якія заквалiфікаваліся да фінальнага галасавання ў міжнародным плебісцыце „Сем новых цудаў свету натуры". Падляшская маршалкоўская ўправа — як гэта кажуць у судова-чыноўніцкай гаворцы — уклала шмат старанняў, каб у гэтым спіску апынулася таксама Белавежская пушча. З ПМУ у апошнія месяцы што і раз наплывалі ў СМІ просьбы агучэння інтэрнэтнай магчымасці галасавання на гэтую кандыдатуру. Разам з чарговымі надсыланымі з гэтай установы заахвочаннямі да галасавання напруга расла быццам у знакамітым фільмавым трылеры. І што? І нічога. Пушча ў катэгорыі „Лясы, запаведнікі і нацыянальныя паркі" прайграла ў гонках, а канкурэнтаў мела не абы-якіх: хоць бы Амазонскую пушчу ці Астравы Пасхі. Падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі зараз пасля аб'яўлення вердыкту швейцарцамі паведаміў у спецыяльна выдадзенай пісьмовай заяве: „На жаль, у групе фіналістаў не апынулася Белавежская пушча, што ўспрымаю з сумам". І далей: „Не трактую гэтага як паразы, хоць, на маю думку, Белавежская пушча выконвае ўсе патрабаванні, каб быць прылічанай да цудаў натуры. Не буду падрываць рашэння экспертаў, якія маюць свае важныя рацыі". Маршалак, інфармуючы, што Пушча апынулася ў групе 261 кандыдатуры, заняла ў сваёй катэгорыі (па-за подыумам) чацвёртае месца, пералічыў „шмат шыракапланаваных прамацыйных дзеянняў" дзеля яе. Заявіў: „Такая комплексная і хуткая — а адначасова вельмі эфектыўная (? — М. Х.) кампанія была праведзена першы раз. Дагэтуль ні адзін з прыродных ці турыстычных атракцыёнаў рэгіёна не праматаваўся так інтэнсіўна і паспяхова". Пры нагодзе падзякаваў з ўдзел у пушчанскай кампаніі агульнапольскім СМІ, уладам Белавежскай гміны, Гайнаўскага павета, Белавежскага нацыянальнага парку, Міністэрству спорту, турызму і асяроддзя, юрыдычнаму факультэту Універсітэта ў Беластоку. Тут адзначыў: „Варта заўважыць, што першасным ініцыятарам усіх прамацыйных дзеянняў, звязаных з конкурсам, былі два суб'екты: Маршалкоўская ўправа ды Белавежская гміна. Для параўнання — кандыдатуру Амазонскай пушчы падтрымлівала аж дзесяць камітэтаў розных краін!" Шкада, што пан маршалак забыўся аб падтрымцы кандыдатуры Белавежскай пушчы г.зв. афіцыйнымі фактарамі Рэспублікі Беларусь, на тэрыторыі якой у час галасавання былі скліканы спецыяльныя камітэты, якія займаліся прамоцыяй Пушчы. У гэтым кантэксце мне здаецца, што самаўрадавым уладам Падляшскага ваяводства залежала, каб „цудам" была толькі польская частка Белавежскай пушчы. А, можа, я памыляюся, бо маршалак забыўся таксама пра ўлады гміны і горада Гайнаўкі. Магдаліна Хірко з гайнаўскай Гарадской управы была — падобна як я — здзіўленая гэтым замоўчваннем:*

*— Мы вельмі ангажаваліся ў гэтую кампанію. Можна было галасаваць на нашай інтэрнэтнай старонцы: www.hajnowka.pl. Залежала нам на тым, бо гэта і для нашага горада была шырокая прамацыйная кампанія, скажам, турыстычная.*

*На канец сваёй заявы маршалак Дважанскі запэўніваў:*

*— Завяршэнне ўдзелу ў конкурсе не абазначае, дарэчы, канца інтэнсіўных праматыйных дзеянняў. Сёлета святкуем 600-годдзе аховы гэтага непаўторнага прыроднага запаведніка (...). Таму вось конкурс „Сем новых цудаў свету натуры" гэта знакаміты пачатак нашых дзеянняў, мэтай якіх з'яўляецца набліжэнне кашатоўнасцей Белавежскай пушчы як найбольшаму ліку асоб ва ўсім свеце". І няхай такі цуд ажыццёвіцца.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Збожжавая прадукцыя стала нерэнтабельнай

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

**Хаця сёлетні ўраджай на Беласточчыне ў агульнасці можна лічыць задавальняючым, дык ёсць месцы, дзе збожжа абрадзіла слабавата. Затое, напрыклад, побач некаторых вёсак на Гайнаўшчыне, дзе знаходзяцца якасныя землі і гаспадары рашыліся пасеяць на іх многа азімай пшаніцы, ураджай ад яе быў настолькі добрым, што намалацілі нават па больш чым 5 тон з гектара. Аднак у гэтым годзе збожжа моцна патаннела і нават гаспадары, што сабралі многа пшаніцы або жыта, не хочуць прадаваць яго за невялікія грошы. Земляробы нервуюцца яшчэ з-за павышэння цаны камбайнавання, што робіць вырошчванне жыта ці аўса нерэнтабельным. Каб не было непасрэдных еўрасаюзных даплат да апрацоўваных палёў у перспектыве чарговых гадоў, у многіх вёсках маментальна маглі б узнікнуць аблагі, а з часам паявіліся б на іх самасейкі і пралескі.**

— Вельмі мала плацяць цяпер за збожжа. Гаспадары абураныя такой цаной. Ізноў земляробаў абулі ў лапці, а пасрэднікі зарабляюць, — заяўляе спадар Міраслаў з Орлі, які гаспадарыць на невялікіх кавалках зямлі. — Частку майго збожжа дашчэнту вымалацію ў канцы чэрвеня віхор. Іншае збожжа прыгожае.

Едучы з Гайнаўкі ў Старое Беразова, у напрамку якасных зямель, на адрэзку можа шасці кіламетраў я ўбачыў сем камбайнаў, якія малацілі сухое збожжа.

— Надвор'е ў час жніва прыгожае, а і ўраджай сёлета добры. Азіміну ў нас практычна змалацілі, а ўжо ўзяліся і за ярыну, — заяўляе Рыгор Мароз са Старога Беразова і пачынае пералічваць прозвішчы шасці гаспадароў з яго сяла, у якіх ёсць свае камбайны.Камбайнеры працуюць на сваіх палях, або малоцяць іншым гаспадарам. Дома адпачываюць у асноўным пенсіянеры, якія ўжо не абрабляюць сваіх палёў. Працуюць таксама жанчыны.

— Гаспадары найбольш наракаюць на нізкую цану збожжа. За пшаніцу плацяць крыху больш за 400 злотых за тону, а за жыта 230-250 злотых за тону. Тыя земляробы, у якіх ёсць якасныя землі, кажуць, што ўраджай пшаніцы ў іх дасягнуў нават да 5-6 тон з гектара. Але, напрыклад, наш сусед, які збірае многа пшаніцы з гектара, ужо з ранняй вясны вылівае на свае палеткі шмат сродкаў аховы расліннасці, бо без гэтага не даб'ешся зараз добрага плёну, — прадаўжае расказ Рыгор Мароз і дабаўляе, што гаспадары з Беразова стрымліваюцца з продажам збожжа для меншых пакупнікоў і чакаюць покі пачнуць купляць вялікія элеватары.

### *Панізіліся цэны збожжа, павысіліся кошты*

У пачатку жніва многа ўласнікаў вялікіх элеватараў, а ў гэтым ліку і ў падбельскіх Ляўках, яшчэ прадавала мінулагоднае збожжа і толькі пазней пачалі скупляць сёлетні ўраджай. Меншыя прадпрымальнікі менш плацілі за збожжа, бо часта куплялі яго для перапродажу. Аднак пазней аказалася, што збожжа і на біржах стала таксама вельмі танным. Да паніжэння цаны збожжа ўжо ў час жніва маглі спрычыніцца нізкія цэны на сусветных рынках і, між іншым, хуткае і рэзкае ўзмацненне нашай златоўкі, а паніжэнне курсу долара і еўра. Пасля такой нечаканай змены курсаў, якія некаторыя эканамісты лічаць спекулятыўнымі, патаннелі ўсе імпартныя прадукты, у тым ліку збожжа, якое зараз можна імпартаваць з усіх краін Еўрасаюза, і не толькі, без мытных аплат. З пачатку жніўня, напрыклад, тону кармавой пшаніцы куплялі на біржы ў Лондане па 103 еўра (больш за 400 злотых). Тыя вытворцы збожжа, што не маюць вялікіх складоў, і сяляне, што змалацілі сыраватае збожжа і мусілі неяк пазбыцца яго, не рашаючыся на дарагое сушэнне, прадавалі свой ураджай танна. Адзін гаспадар з Гайнаўшчыны паведаміў, што ў яго наваколлі за тону жыта плацілі ў сярэднім па 250 злотых, за тону аўса —300 злотых, а за тону пшаніцы — 450 злотых. Зараз даволі малое зацікаўленне кармавой пшаніцай з сёлетняга жніва, бо часта трэба яе яшчэ дасушваць. У Польшчы ў першай палове жніўня за кармавую пшаніцу оптам плацілі толькі 360-380 злотых за тону. Харчовая пшаніца оптам каштавала 420-450 злотых за тону. З-за малой колькасці сонца ў час сёлетніх дажджлівых сенакосаў, калі набіраўся колас, якасць збожжа зараз горшая, чым, напрыклад, была ў мінулым годзе. Гаспадары на скупцы атрымлівалі за харчовую пшаніцу ў першай палове жніўня нават па 350-380 злотых за тону. У параўнанні з мінулым годам, калі тона пшаніцы каштавала па 600-650 злотых, зараз цана яе панізілася прыблізна на 40%. Многа вялікіх гандлёвых суполак не рашаецца масава купляць збожжа, бо разлічвае на далейшае паніжэнне цэн у перспектыве бліжэйшых тыдняў.

У гэтым годзе сяляне сталі нервавацца павышэннем коштаў камбайнавання. Аднак нельга вярнуцца да традыцыйнага жніва, бо зараз цяжка было б знайсці здатныя да працы снапавязалкі і малацілкі.

— У нашым сяле многа камбайнаў, таму камбайнеры намнога цаны на малацьбу не падаб'юць. Зараз нашы гаспадары гавораць, што будуць браць у гадзіну за малацьбу столькі, колькі і другія ў вёсцы. Найчасцей у канцы жніва паведамляюць, колькі трэба плаціць за гадзіну працы камбайна, — кажа Рыгор Мароз.

— Гаспадары, якіх наймалі ў нас да малацьбы збожжа камбайнамі, у гэтым годзе паднялі цану паслуг і цяпер трэба плаціць пад 300 злотых за гадзіну (раней 220-240 злотых). Аднак некаторыя чакаюць камбайнаў з больш аддаленых мясцовасцей, бо бяруць яны за малацьбу менш, нават з разбіваннем саломы. Цяпер штораз часцей земляробы рашаюцца разбіваць салому ў час малацьбы на дробныя кусочкі і пасля прыворваць яе. Нашы гаспадары гадуюць штораз менш быдла і свіней, а ў выпадку большых гадоўцаў, пасля мадэрнізацыі хлявоў і абораў, гадуюць яны жывёлу на плыткіх плітах, дзе падсцілаецца мала саломы, — паведаміў земляроб з паўднёвай часткі Гайнаўскага павета, дзе людзі асабліва балюча адчулі павышэнне коштаў камбайнавання. Збіраюць жа там у асноўным слабы ўраджай на якасна дрэнных землях, а за жыта ці авёс плацяць намнога менш, чым за пшаніцу.

### *Даход з адзнакай мінус*

На пясчаных землях гаспадары намалочваюць па 2-2,5 тоны жыта ці аўса і ў першай частцы жніва маглі разлічваць на плён варты 500-650 злотых з гектара. Каб змалаціць гэты гектар камбайнер працуе ў сярэднім гадзіну часу і таму, заплаціўшы за камбайнаванне, для гэтых людзей аставаўся невялікі прыбытак, бо толькі каля 350 злотых з гектара. Калі адлічыць яшчэ ад гэтага кошт падрыхтоўкі зямлі да сяўбы, мінеральных угнаенняў, сродкаў аховы расліннасці і іншыя сельскагаспадарчыя і транспартныя выдаткі, дык прыбытак атрымліваецца з адзнакай мінус. Пры такой нізкай цане збожжа, якая была ў пачатку жніўня, земляробаў не ратавалі нават еўрасаюзныя даплаты да апрацоўкі палёў і даплаты да гаспадарання ў цяжкіх умовах. Спецыялісты лічаць, што на атрыманне якаснай пшаніцы з аднаго гектара трэба выдаткаваць 2,5-2,8 тысячы злотых і таму нават на якасных землях цяжка вярнуць зараз грошы, укладзеныя ў прадукцыю збожжа пры ўраджайнасці 5-6 тон з гектара.

### *Ці выйграюць тыя, што пакінуць збожжа зімаваць?*

Цэны збожжа на сусветных рынках будуць паніжацца, — так інфармавалі ў жніўні аналітыкі раслінай вытворчасці. Маюць да гэтага спрычыніцца высокія запасы збожжа на свеце і даволі высокі сёлетні ўраджай, калі не памяшаюць у гэтым прыродныя стыхіі. Міжнародная збожжавая рада нядаўна павысіла прагноз сусветнага ўраджаю на 18 мільёнаў тон — да 1733 мільёнаў тон. Адначасна Рада разлічвае, што запатрабаванне на збожжа ў свеце ў параўнанні да апошняга сезона пабольшае на 5 мільёнаў тон, да рэкорднага ўзроўню 1736 мільёнаў тон. Хаця прадбачваецца паніжэнне прадукцыі пшаніцы ў гэтым сезоне на 33 мільёны тон, да 654 мільёнаў тон, то яе запасы ў канцы сезона 2009-2010 пабольшаюць на чарговыя 13 мільёнаў тон і будуць састаўляць 174 мільёны тон. Паводле спецыялістаў, пабольшаныя запасы і недастатковае ў адносінах да іх запатрабаванне на збожжа будуць спрычыняцца да ўтрымання нізкіх цэн збожжа ў бягучым і чарговых гадах. Аднак адначасна эканамісты гавораць, што пасля хуткага ўзмацнення злотага можа на працягу года прыйсці паніжэнне курсу нацыянальнай валюты і ў гэтым бачаць адзін з галоўных шанцаў на павышэнне цаны збожжа ў Польшчы. Усё ж такі цяжка цяпер прагназаваць нейкае большае павышэнне цэн збожжа зімой ці вясной, а хутчэй за ўсё невялікія ваганні ад сённяшняй цаны ўверх або ўніз.



Збожжа на палях малоцяць камбайны розных марак, але яшчэ часта можна ўбачыць славутыя „Бізоны”

## Новае ў Міхалоўскай гміне

У Міхалоўскай гміне ў мінулым годзе праклалі водаправоды з Саколя ў Жэдню, у вёсачцы Полька каля Сушчы і на калёніі Міхалова. У гэтым самым годзе адрамантавалі дарогі з Юшкавага Груда ў Ціванюкі і далей у Кухмы ды ад асфальтаванай шашы Сушча — Новая Воля — Міхалова ў Круглы Лясок, а таксама з Ляўшоў у Рабінаўку.

Мадэрнізавалі вуліцу Ліпавую ў Ялоўцы ды Гарадоцкую ў Міхалове.

Правялі рамонты пажарных дэпо ў Ялоўцы і Новай Волі. У Міхалове пабудавалі вадасховішча і амфітэатр ля таго ж азерца.

Зараз у хуткім тэмпе ідзе пабудова ратушы ў цэнтры Міхалова (1 студзеня 2009 г. Міхалова атрымала гарадское права).

## Даўнія песні над Нарвай

У нядзелю, 26 ліпеня г.г., у Ваневе над ракой Нарвай (гміна Саколы) адбыўся III Фестываль народнай песні „Даўнія песні, маладыя галасы”. У конкурсе прыняло ўдзел 25 фальклорных ансамбляў, салістаў, дуэтаў, квартэтаў ды капэл з усяго Падляшскага ваяводства.

У катэгорыі дуэтаў першае месца здабылі Аляксандра Карнілюк і Раксана Вышкоўская з Бельска-Падляшскага, а трэцяе — Уршуля і Юстына Садоўскія з Макаўкі (Нарваўская гміна). У групе квартэтаў другое месца заваяваў маладзёжны квартэт з Чаромхі. Вылучэнне атрымаў фальклорны калектыў „Цаглінкі” са Старога Ляўкова.

Старое Ляўкова

## Перспектыўны бусел

У Старым Ляўкове Нараўчанскай гміны бусел пачаў быў будаваць сабе гняздо толькі ў палове ліпеня гэтага года. І ўвесь час замаруджваў. Будаваў яго і будаваў. З кожным днём ягонае гняздо расло ўшыр і ўвысь.

Як вядома, буслы адлятаюць ад нас у цёплыя краіны ў канцы жніўня. Гэты бысел, што ў Ляўкове, як казалі, не спаў у шапку. Задумаў пабудаваць сабе буслянку яшчэ да адлёту. Гатовае гняздо будзе чакаць яго ў 2010 годзе! Вось які перспектыўны бусел! Жыхары Ляўкова з чымсьці падобным раней не сустракаліся.

Новае Ляўкова — Плянта

## Гэтая бяроза зваліцца на дарогу

З Новага Ляўкова ў Нараўку і далей у Гайнаўку бяжыць ваяводская асфальтаваная шаша. Перасякае яна лясы і пралескі. Стаяць ля яе дарожныя знакі „Зважай на лясную звярыну”. Перад Плянтай першы за Ляўковам паварот управа. І тут у рове з правага боку стаіць пахіленая бяроза, якая, калі будзе падаць, дык на маставую дарогі. Яна з'яўляецца пагрозай для праязджаючых аўтамашын, матацыклістаў, веласіпедыстаў ды пешаходаў. Бяроза вісіць над іх галавой і трымаецца „на валаску”.

Дарожныя службы не заўважаюць гатага небяспечнага для праязджаючых дрэва, ці што? Чакаюць, калі яно паваліцца на маставую гэтай рухлівай дарогі? **(яц)**

# Зноў крадуць быдла

Тэкст і фота
Міхала МІНЦЭВІЧА



*Юры Хаманскі: Зладзеі ведалі, калі я прыязджаю ў поле*

Жывёлы ў гаспадарцы — каровы ці коні — здаўна былі неабходнымі спадарожнікамі чалавека, гарантуючы ягонае пражыванне. Сучаснае жывёлаводства адбываецца на пашы, яно рызыкоўнае стратамі і суправаджаецца стрэсам у дадатак да працаёмкасці. Па гэтай прычыне многія сяляне больш схільныя займацца раслінннай вытворчасцю. Цяперашнія законы аб ахове бяздомных сабак і ваўкоў ды беспрацоўе ці — лепш сказаць — пошукі лёгкага заробку ствараюць небяспеку гаспадарскай жывёле. У Арлянскай і суседніх гмінах каля 2000 года страты наносілі бяздомныя сабакі (было ў „Ніве” ад 23.07. і 29.10. 2000 г.), ваўкі („Ніва” ад 26.09.1999 г.), а два гады таму ваўкі падышлі пад самую Орлю („Ніва” ад 07.10.2007 г.) У 2004 годзе былі выпадкі пакраж коней з паш („Ніва” ад 01.08.2004 г.) Агулам у Арлянскай гміне можна падлічыць звыш дваццаці такіх здарэнняў у мінулых гадах (ад сабак, ваўкоў і зладзеяў). Раней кралі па начах, але зараз зладзеі крадуць нахабна, сярод белага дня, зарэзваючы быдла на пашы і забіраючы ад яго кавалкі ялавічыны, быццам некаму на закуску. Бывае, што крадуць цяля на раты, калі на пашы падрэзваюць горла, а пасля цягнуць яго на ланцугу — яшчэ жывое — далей, каб схавацца і там забраць мяса. Так здарылася каля Вулькі 11 ліпеня г.г. пасля поўдня ў спічкоўскага селяніна Юркі Хаманскага. Бяда за ім не ходзіць у адзіночку, бо годам таму быў ён моцна паранены адной са сваіх кароў. Цяпер ён гладзіць тую карову, быццам дзякуючы, што тады яго не забіла ці акалечыла на ўсё жыццё.

Юрка Хаманскі з'яўляецца адным з буйнейшых гаспадароў у Арлянскай гміне — разам з жонкай абрабляюць яны каля ста гектараў угоддзяў, гадуюць малочных кароў гольштэйнска-фрызійскай пароды, трымаюць некалькі коней і статак авечак. У іх новая абора і амаль тысячалітровы малочны танк з даільнай апаратурай.

У нядзелю, 12 ліпеня, селянін зноў наведаў мяне дома. І склалася такая традыцыя, што прыязджае да мяне з клопатамі — каб „Ніва” паведамляла пра здарэнні, каб улады выконвалі свае абавязкі па ахове ад зладзеяў. Бо на месцы здарэння патрэбныя паліцыя, ветэрынар і карэспандэнт „Нівы”, якая ў мінулым шмат пісала і дапамагала.

— Было толькі два гады спакою, — расказаў мне Юры Хаманскі, — з таго часу, калі ваўкі загрызлі двое маіх цялят. Зараз выпасаю дваццаць чатыры цяляты рознага ўзросту на лугах ад Вулькі да мяжы парцаўскіх палёў. У суботу, 11 ліпеня, я, як заўсёды, каля 18-й гадзіны прыехаў паіць сваю жывёлу. Гляджу, што каля Вулькі няма апошняга цяляці вагой пад трыста кілаграмаў; было яму год і чатыры месяцы. У месцы, дзе яно было прывязанае, была свежая кроў на траве — відаць зладзеі падрэзалі яму горла. Але, мабыць, яно ім вырвалася і пабегла на другі бок чыгуначнага пуці і там дайшло, бо асталася лужына крыві. Зладзеі, відаць было па слядах, ланцугамі перацягнулі яго — магчыма, яшчэ жывое — цераз пуць назад, зацягнулі за шашу Орля — Бельск, дзе стаіць знак пагранзоны, і адтуль палявой дарожкай у недалёкі лясок, які прымыкае да Галадоўскага лесу.

Я адразу патэлефанаваў у Бельск на паліцыю і ўжо разам знайшлі пакінутыя вантробы, бо злачынцы на той дарожцы загразлі пасля дажджу. І ў спешцы выпусцілі вантробы, пакідалі нейкія канаты, наплечнік, прынесенае голле. Некаторыя жыхары Вулькі бачылі той самаход, цёмную чырванаватую легкавушку, але падумалі, што нехта збірае зёлкі і бегае вакол самахода. Мяркую, што гэта былі свае зладзеі, бо ведалі, калі я прыязджаю на пашу перачапіць дабытак; гэта свае сабакі і яны спяшаліся, каб паспець да майго прыезду. Бо калі б яшчэ з дзесяць хвілін, то я іх засціг бы...

— А навошта зладзеям ялавічына? — пацікавіўся я.

— Была гэта ялаўка французскага вываду, бо іншых я не гадую. Мяркую, што зладзеі завезлі мяса недзе ў мясарню, або на рынак, або папоўнілі свае халадзільнікі, бо чыстага мяса было там каля ста пяцідзесяці кілаграмаў. Падазраваю, што яны хацелі ўкрасці большае цяля, але яно стаяла далей і яны забралі тое, што было найбліжэй, пад рукой, меншае.

Паліцыя зняла сляды: недакурак, кавалак каната, пабітую аўтамабільную лямпу, сляды шын, зрабілі здымкі. Паліцыянты былі на месцы недзе да 23-й гадзіны, а пасля я яшчэ сам з самахода пільнаваў таго месца, дзе зладзеі загразлі. І каля другой гадзіны ночы здалёк паказалася святло ліхтарыка — мабыць злодзей ішоў па пакінутыя рэчы. Калі я стаў ехаць у яго напрамку, ён схаваўся недзе ў збожжа.

Цяпер я дадумваюся, што гэтую пакражу рыхтавалі два тыдні раней, бо тады я заўважыў, што адно цяля было прывязана за рогі, а я так не вяжу; мабыць, тады тое цяля ім вырвалася.

— А што з кампенсацыяй страт?

— А хто яе дасць? Мо калі атрымаю пасведчанне ад ветэрынара, то напішу войту прашэнне — мо зніме крыху падаткаў. Я гадую найбольш быдла на ўсю Арлянскую гміну; у Спічках іншых жывёлаводаў няма, але поле абрабляюць многія.

— Сёлета многія гаспадары пацярпелі ад дажджоў, а ў Вас многа жывёлы — як Вы яе перазімуеце?

— Сухога сена яшчэ не маю, але думаю, што ўдасца сабраць. Загатовіў я 280 кіп сіласу. Калі вечарам пакажацца сонейка, то я і пяцьдзесят кіп за дзень вазьму, бо маю свае фальговачныя машыны. Людзям пагніло сена, а мне град пабіў бульбу і кукурузу.

— Ці сялянам варта вырошчваць збожжа; што з мінулагоднім ураджаем?

— Вельмі таннае яно, менш пяцідзесяці злотаў за цэнтнер. У мяне яшчэ трыццаць тон леташняга, якое прадаў у бельскае збожжасховішча, але яшчэ не атрымаў грошай. Не хочуць плаціць, толькі гавораць, каб забіраць. А калі я тое збожжа здаваў, то гаварылі каб прыязджаў, калі будуць мне патрэбныя грошы, то заплацяць. А пакуль то ім трэба плаціць за захоўванне па пяць злотаў ад тоны за месяц.

— У Вас ужо дастаткова гадоў, каб пайсці на структурную пенсію, а Вы яшчэ гаспадарыце...

— Маю ісці на пенсію ў дзевяцьсот злотаў на дзве асобы? Цяпер структурная пенсія не такая салодкая.

— І так цяжка працуеце?

— Але люблю гэтую працу, бо калі б не любіў, то кінуў бы і сядзеў бы на лаўцы.

— А як думаеце: ці Еўрасаюз забяспечыць поспех нашай сельскай гаспадарцы?

— Еўрасаюз разбазарвае маладых, бо хапаюцца, каб атрымаць даплаты, напрыклад, пяцьдзесят тысяч на вялікі трактар. Бяруцца толькі за вырошчванне збожжа. Але няхай тым маладым паўміраюць старэйшыя сямейнікі (што ўносяць свае пенсіі — М. М.), тады пабачаць.

# Прэзентацыя народных песень і вырабаў

Тэкст і фота
Аляксея МАРОЗА

**Беларускія песні, побач з польскімі, традыцыя і культура прэзентаваліся ў час Дзён Гайнаўкі з 31 ліпеня па 2 жніўня ў амфітэатры, гарадскім парку і спартыўным асяродку. На нашай мове выступілі спевакі з Гайнаўскага дома культуры, калектывы з Беласточчыны і гурты з Беларусі. У гарадскім парку, а пасля ў амфітэатры сабраліся людзі ўсіх узростаў. Моладзь у галоўным састаўляла публіку на спартыўных спаборніцтвах і канцэртах маладзёжных гуртоў. Старэйшых прыцягнуў „Кірмаш зубра”, дзе апрача выступаў народных калектываў прапанавалася харчаванне, мастацкія работы і рукадзелле. Бліжэй уваходу ў амфітэатр распалажыліся госці з Пружан і Свіслачы. Па-суседску ад замежных гасцей былі беларускія і польскія майстры з Беласточчыны і іншых мясцовасцей.**

— Мы рашыліся спалучыць прэзентацыю народных песень і народных вырабаў, бо яны дапаўняюцца, — патлумачыў дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка. — У нас вельмі добрае супрацоўніцтва з беларускімі прыгранічнымі раёнамі, плён нам чаго з'яўляюцца частыя гастролі ў нас калектываў з Беларусі. Некаторыя папракаюць нас у тым, што арганізуем замнога беларускіх мерапрыемстваў, але ёсць на іх грамадскае запатрабаванне. У час канцэртаў беларускіх калектываў наш амфітэатр бітком набіты, калі ў час іншых мерапрыемстваў збіраецца намнога менш публікі.

Жанчыны з пружанскіх калектываў былі рады, што іх спеў спадабаўся гайнавянам.

— Нам вельмі падабаецца „Кірмаш зубра”. Мы пад уражаннем вялікай гасціннасці гайнавян. У гэтым годзе прыехала „Пружаначка” і квартэт „Шчырым сэрцам”. Мы ўжо трэці год прыязджаем да вас з беларускімі народнымі песнямі, — сказала Тацяна Радзівончык, дырэктар Раённага метадычнага цэнтра культуры ў Пружанах.

Гайнавяне затрымліваліся каля саламяных вырабаў. Самая вялікая саламяная ваза каштавала 100 злотых, але былі і невялікія бранзалеты па 3 злоты.

— Я ўжо 22 гады раблю вырабы з саломы і магу ўжо нават пад тысячу штук саламяных прадметаў выканала, — сказала Раіса Баюра з Пружан.

Марыя Кулецкая, якая малюе на шкле, стала лаўрэатам конкурсу на „Славянскім базары” ў Віцебску.

— Роспіс на шкле сустракаецца ў Беларусі рэдка, хаця гэта цікавыя працы. Спачатку трэба зрабіць малюнак на шкле, а пасля прыкрыць яго ззаду фольгай і кардонкай. Нядаўна я вучыла роспісу на шкле дзетак на летніку ў Студзіводах, — сказала Марыя Кулецкая з Пружан. — Свае працы я прадаю ў час народных фэстаў і ў магазіне „Скарбніца” ў Брэсце.

У час кірмашу выступіў таксама калектыў „Дубіны”. Побач народных майстроў з Пружан расклаліся са сваімі работамі творцы са Свіслачы.

— Я прадаю алейныя карціны з краявідамі і абстрактныя работы, — заявіў Мечыслаў Саўко са Свіслачы. — У мінулых гадах бывала, што на „Кірмашы зубра” прадаваў я па 10-20 карцін, а зараз застой. Можа з-за крызісу людзі сталі бяднейшымі.

Частку дрэўляных стэлажаў і столікаў, якімі карысталіся госці з Беларусі, выканаў Мікола Яноўскі са Старога Беразова. Ён стаяў побач майстроў са Свіслачы і таксама прапанаваў свае алейныя карціны.

— Пакупнікі прыязджаюць па мае карціны нават у Старое Беразова. Апошнім часам сталі заказваць іх



Раіса Баюра (справа) прапанавала саламяныя вырабы, а Марыя Кулецкая — малюнкі на шкле

у якасці вясельных сувеніраў, — сказаў мастак Мікола Яноўскі.

Святаслаў Ляшчук са Свіслачы прапанаваў вырабы з драўніны. Ён майстар пляцення і вырабаў з карэння:

— Мае работы выконвае найчасцей сама натура, а я толькі дапрацоўваю іх, — сказаў ён.

— Вырабы народных творцаў з Падляшша розняцца не толькі тэхнікай іх выканання, але перш за ўсё тэмамі работ. На Беласточчыне выконваюцца больш самабытныя вырабы, а ў нас больш сучасныя. Аднак мы стараемся ісці ў напрамку традыцыі, так як гэта робяць вашы майстры, — гаварыла Наталля Пучкіна, дырэктар Дома рамёстваў у Свіслачы, пры якім дзейнічае Клуб народных майстроў.

Наталля Пучкіна выступае таксама ў народным калектыве „Мілавіца”, які даўнія песні выконваў на кірмашы і на сцэне амфітэатра ў час канцэрта „Музыка спалучае пакаленні”. На гэтым канцэрце ўдала выступілі калектывы „Рэха пушчы” з Гайнаўскага дома культуры і „Рэчанька” з Козлік. Прадстаўніком ГДК на мерапрыемстве быў таксама гурт „Аўра”, які выконвае ўсходнеславянскія песні.

На кірмашы было многа майстроў з Падляшша. Галіна Бірыцкая і Яніна Плева паказвалі гафтаваныя і карункавыя вырабы, якімі захапляліся гайнавяне.

— Я гафтую, раблю кручком і на прутках. Рукадзеллем займаюся яшчэ са школьных гадоў, — сказала Галіна Бірыцкая з Плянты.

— Апошнім часам вяртаецца мода на карункавыя і гафтаваныя вырабы. Людзі засцілаюць гафтаванымі абрусамі вялікія сталы, вяртаецца мода на карункавыя фіранкі, — гаварыла Яніна Плева з Гайнаўкі.

Маладзёжныя калектывы выступілі на трэці дзень мерапрыемства. Перад публікай прэзентаваліся, між іншым, гайнаўскія „Перапёлка” і дзяўчаты са Студыі эстраднай песні. Многа выканаўцаў з розных мясцовасцей Польшчы прыбыло на конкурсныя спаборніцтвы. Былі таксама запрошаны польскія калектывы да пазаконкурсных выступаў, а музычнае мерапрыемства закончылася феерверкамі.



Калектыў „Мілавіца” са Свіслачы займальна выступіў у гарадскім парку

У першы дзень гайнаўскіх святкаванняў арганізатары паставілі на спорт. Мясцовыя і прыезджыя інваліды радаваліся, што могуць спаборнічаць і перамагаць. Многа нашых хлопцаў-пагранічнікаў з навакольных сёл удзельнічала ў футбольным турніры. Перамагла камада пагранічнай заставы з Дубіч-Царкоўных, другое месца заняла пагранзастава з Белавежы, трэцяе — пагранічнікі з Семяноўкі, а на чацвёртым апынуліся олдбоі з Гайнаўкі.

## Бязрогія зубры

Гайнаўка з кожным годам прыгажэе. Гэта можна заўважыць і ў цэнтры горада, і на яго акраінах. Рамантуюцца вуліцы, пракладаюцца тратуары, аднаўляюцца жылыя будынкі, магазіны. Але сустрэнеце ў горадзе і такое, што псуе яго выгляд. На скрыжаванні вуліц Спартовай, Баторыя і а. Дзевятоўскага, у цэнтры горада, стаяць скульптуры трох зуброў. Вельмі добра, што такім чынам вядзецца рэклама турызму, сімвалам якога ў нас з'яўляецца зубр — цар Белавежскай пушчы. Цяпер Гайнаўку наведваюць шматлікія айчынныя і замежныя турысты, прыязджае школьная моладзь. Кожны дзень каля зуброў праходзяць сотні, калі не тысячы людзей. Бяда, аднак, у тым, што двум зубрам нейкі вандал адламаў рогі. Бязрогія зубры выглядаюць жахліва і, калі не адпалохваюць, дык напэўна не прыцягваюць турыстаў.

На жаль, на гэтае хуліганства тэрмінова не рэагуюць гарадскія чыноўнікі, не клапоцяцца аб аднаўленні скульптур. Варта было б, каб некаторым чыноўнікам за абыякавасць да скульптур народ прыгадаў, што выява зуброў сведчыць таксама пра іх саміх.

**Мікіта ДРОЗД**

## Кузаўская праблема

Пасля асфальтавання дарогі Кузава — Рэпчычы рух аўтамабіляў на гэтым адрэзку значна павялічыўся. Жыхары вёскі перажываюць кашмар па прычыне „каскадзёраў”, якія не прытрымліваюцца правілаў дарожнага руху і ганяюцца па вуліцы з вялікай хуткасцю. Небяспеку дарожнай аварыі ствараюць два небяспечныя павароты каля царквы. Пры канцы ліпеня нейкі шафёр (пры ўездзе да вёскі) патрацій з бака салярку (прычына — празмерная хуткасць на павароце пры поўным баку паліва). Алеістая пляма пратрымалася некалькі дзён, пакуль не змыў яе дождж. У такім выпадку лёгка можна было пакаўзнуцца на забруджаным салярка асфальце! Праблему „каскадзёраў” на кузаўскай вуліцы я раней кранаў на старонках „Нівы”, але гэта агульнавядомая гарошына аб сцену. Ці органы правапарадку чакаюць аж людзі пацерпяць у дарожным выпадку?

Чаромха

## Сапсавалі дарогу

Вуліца Вішнёвая ў Чаромсе належыць да рухлівых дарог. Жвіроўка тут ненайлепшай якасці. У час сёлетніх дажджоў парабіліся такія ямкі, што шыю можна скруціць. Жыхары пасёлка і гмінныя радныя падавалі заявы на асфальтаванне вуліцы, але войт тлумачыць, што ў першую чаргу трэба пракласці каналізацыю, а пасля брацца за асфальтаванне. Пагаджаюся з такой аргументацыяй, аднак ёсць малое „але”. Пакуль пачнуцца інвестыцыі, трэба падумаць прынамсі аб належным утрыманні цяперашняй дарогі. У мінулых гадах гміна раўняла гравейку экскаватарам. Зараз робіць падсыпку. Нядаўна ямкі завезлі пяском. У час сонечнага надвор'я пясок высах і стварыўся пясчаны нанос, праз які на ровары немагчыма праехаць. Няўжо гмінныя чыноўнікі лічаць, што Вішнёвая прызначана адно для аўтамабільнага транспарту? Калі так, дык варта задбаць пра адпаведныя дарожныя знакі.

**(ус)**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# З бабуляй у пілігрымцы



*Вікторыя (у калясцы) з сяброўкамі і бабулямі*

Тыдзень таму мы сустрэліся ў Мастаўлянах. Я распытвала ў іх пра дарогу ў двор Каліноўскіх. Пасля мы сустрэліся яшчэ ў Беластоку, ля сваёй царквы. Вікторыя трымала моцна бабулю за руку і з цікавасцю глядзела на мяне вялікімі, зыркімі вачыма. Я прывіталася з дзяўчынкай з ільнянымі, русымі валасамі. Ёй было дзіўна, што нейкая цётка пытае яе па-беларуску. І, відаць, прыемна. На такой жа мове размаўляе яе мілая бабця з сяброўкамі ў белых хустачках на галаве.

— Вы ўжо вярнуліся з адпачынку? — пытаю ў жанчыны.

— А што там без работы сядзець, — кажа яна. — Трэба ж да пілігрымкі падрыхтавацца. Спачатку ў Супрасль пойдзем, пасля на Грабарку...

— Разам з унучкай.

— А як жа. Трэба малых прывучаць!

Вось і сустрэліся мы трэці раз, 9 жніўня г.г. у Агароднічках, на пілігрымцы да Супрасльскай Іконы Божай Маці . У цудоўнай кампаніі! Усе бабулькі з унукамі, некаторыя дзеткі яшчэ ў калясках. Ці запамятаюць лясную дарогу са святымі песнямі? А можа астанецца ў памяці пах мядовых лугоў і жывіцы, што выцякае з соснаў? Такім паветрам здарова дыхаць, хочацца спяваць...

Лета і час канікул для многіх дзяцей і моладзі — час паломніцтваў.



*Марк Моцька з Касяй і Ігарам*

На іх сустракаю шмат знаёмых з беларускага садка, з беластоцкай „чацвёркі", гімназіі, ліцэя. Сярод мора галоў паломнікаў бачу Олю Каліну з братам Міхалам (ужо студэнтам), дэкламатаркі і спявачкі з „чацвёркі" — Юстынку Апольскую і Аню Аляксейчык, дзетак з праваслаўнай школы. Тут „нанова" знаёмлюся з сямейкай сябры яшчэ з часоў БАСу. Разам з ім у пілігрымку адправіліся дачушка Кася і сынок Ігар.

— А наймалодшае дзіцятка асталося з мамай у хаце, — дадае з гонарам бацька Марк.

— Як вам ідзецца? — пытаю ў новых знаёмых. — Ці не баляць хоць ножкі?

— А што тут за дарога! — чую ў адказ. — Як на шпацыр які выйшлі, нават няма як стаміцца.

Падобнай думкі група паломнікаў з Гродна. Моладзь прыехала спецыяльна на пілігрымку. Не ведалі, што з Беластока ў Супрасль толькі дзесяць кіламетраў.

— Калі б не мяжа, — кажуць яны, — мы б пяшком з Гродна прыйшлі. Хоць бы стаміліся, як належыцца пілігрымам.

Сапраўды, многія з маладых пілігрымку ў Супрасль успрымаюць як „падрыхтоўку" да вялікага паломніцтва на Святую Гару Грабарку.

Чаму ідуць у пілігрымку, раняць ногі, змагаюцца з лянотай і бяздзейнасцю, замест ляжаць і загараць на пляжах?

— Бо як пайду ў паломніцтва, то буду мець лепшыя ацэнкі ў шостым класе, — кажа пяцікласнік Марцін з Беластока. Адкуль ведае? Бабуля сказала.

**Фота і тэкст ЗОРКА**



# Бацька і сыны

Бацька навучаў сыноў, каб яны жылі ў згодзе; яны не слухалі. Вось ён загадаў прынесці венік і кажа: „Пераламіце!"

Колькі сыны ні мардаваліся, пераламаць не маглі. Тады бацька развязаў венік і загадаў ламаць па адным прутку.

Сыны лёгка пераламалі паасобку ўсе пруткі. Тады бацька кажа:

— Гэтаксама і вы: калі будзеце жыць у згодзе, ніхто вас не зможа, а калі будзеце сварыцца, усякі вас лёгка здолее згубіць.

**Леў ТАЛСТОЙ**



Фота Ганны КАНДРАЦЮК

На канікулах у бабулі ў Бяндзюзе

Міра ЛУКША

## Оцэлот з Опакі

У адной вёсцы на Падляшшы ацэлот,
быццам накручаны, ускарабкаўся на плот.
— Я оцалот з Підляшша, — заявіў,
Можа замяўкаў, а можа і завыў,
бо не скажу я, што тутака рабіў,
хто ж ацэлота ў Апаку прытурыў.
Рабенькі, рыхтык цёткі Надзі Кіт,
але ж вялізны, бы надзьмуханы, сядзіць,
і кажа: „О! Я быццам у Тэхасе буду жыць!
Есці кураціну, асколу з мёдам піць,
і запіваць галушкі малаком.
Харошы ў Еўропе у Апацы дом!
Рассеўшыся на шэнгенскай мяжы,
не мусіш працаваць, — адно ляжы,
або сядзі, як той кароль, у жыце ці аўсе...
Як добра маюць ацэлоты тут усе!”
Нашкрабаў кіпцем лозунг ацэлот:
„Жыве Опака!” — на ўсенькі плот.
„О, пака жыў!” — апачна перавёў народ
і разам з ацэлотам сеў на плот.

## ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЧЫЕ ВОЧЫ НАМ СНЯЦЦА ШТОНОЧ

— *Што здарылася? — спытаў я ў Лаўрыка, калі той зайшоў неяк раніцай да вашага дзядзечкі, і на твары ягоным чыталіся сполах, цікавасць і недаўменне.*

— *Дзядзечка Сід! Я не ведаю, што здарылася, — тыя ж недаўменне і лёгкі сполах гучалі таксама і ў ягоным юначым голасе.* — Толькі... мне ўжо каторую ноч сніцца адно і тое ж.

— *Так, так!.. — падсунуў я яму бліжэй плецены лёгкі фатэль, адразу зацікавіўшыся гэтай гісторыяй.* — Раскажы падрабязней.

— *Ведаеце..., днём нібы ўсё нармалёва. Але як толькі надыходзіць ноч і на небе запальваюцца зоркі, як толькі паступова засынаю, мне пачынаюць сніцца... нечыя вочы. Нічога болей, адны вочы! — голас Лаўрыка па-ранейшаму быў усхваляваны. — Пастаянна, штоноч, незалежна ад таго, на якім баку сплю: на правым, на левым ці ўвогуле на спіне!..*

— *Цікава, цікава, — пасміхаўся ў свае амаль што сівыя вусы ваш верны слуга.* — А якія яны, тыя вочы?

— *Якія?.. — тут Лаўрык на хвіліну задумаўся.* — Ведаеце, а яны прыгожыя.

— *Прыгожыя? Гэта добра. А яшчэ?*

— *А яшчэ так уважліва глядзяць на мяне, нібы бачаць упершыню, і ім гэта падабаецца.*

— *А табе?*

— *І мне... Асабліва, калі бачу ў тых вачах мігатлівыя зоркі, якія немагчыма разгледзець скрозь сон, далёкае пяшчотнае мора, дзе не быў ніколі ў жыцці, травяны закалыхваючы поплаў, дзе ўсе кветкі — як гэтыя вочы, а гэтыя вочы — як усе тыя кветкі. А бачу я гэта — таксама штоноч...*

— *Вось і цудоўна! — толькі і адказаў яму, ужо прыблізна ведаючы, што да чаго. — Ідзі, Лаўрычак, падыхай добрым летнім паветрам. Калі ты так выдатна ведаеш свае сны, значыць, нешта ўпускаеш наяве.*

*Ён недаўменна зірнуў на мяне. Аднак, не задаючы болей пытанняў, ціха выйшаў.*

*За акном, на вуліцы, буяў жнівень. Галасна, звонка спявала сонца, і ўсе дрэвы свяціліся, проста ззялі зяленівам ад тых радасных, крыху смяшлівых гукаў.*

*А яшчэ па той вуліцы ішла жнівеньская дзяўчынка. І ў ейных вачах блукалі рэшткі юначага сну, дзе былі і мігатлівыя зоркі, і далёкае пяшчотнае мора, і травяністы закалыхваючы поплаў, і ціхі шэпт палявых кветак, якія так хацелася — гэтак жа ціха і закалыхваючы — цалаваць.*

*Цікава, ці сустрэнуцца яны сёння?..*

**Ваш Дзядзечка Сід**
**4 ліпеня 2009 г., Кобрын**

# Музыка з кайфам

### Ярка гарыць „Зніч”



Фота СТЭПА

Пра гэты гурт найлепш было б пісаць перад купальскай ноччу. Гэтае свята якраз найбольш асацыюецца з язычніцкім мінулым, а музыканты, пра якіх распавяду, з язычніцкімі ідэямі сябруюць штодзень. Алесь Таболіч, лідар, вакаліст, звычайна працуе татуіроўшчыкам і графікам. На ягонай левай руцэ віднеецца вялікі чырвоны (!) татуаж.

— Гэта такое генеалагічнае дрэва, — распавядае.

Татуаж, які ўжо ўзнагароджваўся на конкурсах, выклікае зацікаўленне і здзіўленне.

— Так, ты яго не бачыла раней, бо я яго зрабіў паўгода пасля нашай сустрэчы.

Праўда, з Алесем мы не бачыліся пару гадоў. У 2008 годзе яго гурт „Зніч” не папаў на „Басовішча”. Сёння Алесь смяецца з гэтага і жартуе з тых, якія з-за віз таксама не трапляюць на фестываль.

— З візамі трэба спраўляцца раней! — асцерагае сваіх калег.

На юбілейным фестывалі яны проста мусілі выступіць. Музыку гурту „Зніч” паважаюць не толькі ў Беларусі, але таксама і ў Польшчы.

— Гэта сапраўды класны гурт, — абменьваюцца заўвагамі падляшскія юнакі. — Мала такіх выдатных гуртоў у жанры паган-метал!

Я так часта паган-металістаў не слухаю, але за „Знічом” сачу ўжо амаль дзесяць гадоў. Можа і таму, што з яго лідарам проста ахвота сустракацца, а пры нагодзе і даведацца пра тое, над чым гурт працуе, якія ў яго планы і думкі. А вось гэты год для „Зніча” вельмі важны. Пасля трохгадовага перапынку з'явіцца чарговы ягоны альбом. Праца ідзе, ужо кружыць самотнік „Змрок”, а на восені слухачы павінны мець магчымасць купіць альбом. Так як і ў выпадку гарадоцкага гурту „RIMA”, так і „Зніч” хоча засярodзіць слухачоў на новым гучанні і цікавых прапановах. Будуць гэта моцныя фолькавыя акцэнты і вельмі змрочныя кампазіцыі.

— Мы любім сваіх слухачоў, — кажа Алесь, — любім таксама сваю музыку, можа таму нас так добра ўспрымаюць.

Мы таксама любім „Зніч”!

**i_basovka@o2.pl**

## Вершы Віктара Шведа

### Размова сяброў

Сустрэлася двух сяброў.
— Што робіш? Лётаю ізноў.
— Як пілот? — Не, лётаю
Цяпер за работаю.

— А што ты? — Я плаваю.
— Дык гэта цікава.
Як матрос на марах?
— Не, плаваю ў даўгах.

## *Польска-беларуская крыжаванка № 33*

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 28:

Рэпартаж, Марс, яр, Ака, выстаўка, ластаўка, ар, арт, плён, ты, туман. Ліпа, ява, рыс, ён, стан, аматар, Ракаў, ну, траўка, Ас, карта, на, тын.

Узнагароду, ***кніжку Міры Лукшы „Дзяўчынка і хмарка”***, выйграла **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



# Майсеневы прапановы

*Успаміны былога старшыні Ваяводскага праўлення Гмінных кааператываў у Беластоку Яна Вяжбіцкага, які ў 1962-1970 гг. супрацоўнічаў з Канстанцінам Майсенем.*



Ян Вяжбіцкі

Павятовае праўленне Гмінных кааператываў у Гайнаўцы праводзіла сваю гаспадарчую дзейнасць на вясковай тэрыторыі ўсяго павета. Зводзілася яна да забеспячэння вясковага насельніцтва прадуктовымі і прамысловымі таварамі ды сродкамі для сельскагаспадарчай вытворчасці, скупкі збожжа і жывёлы. У гайнаўскай сядзібе ППГК працавалі мясны завод, пякарня і разлівачны цэх. Вельмі важнай задачай была кантрактацыя пладоў і жывёлы. Ад выканання плана кантрактацыі залежала забеспячэнне гарадскога насельніцтва ў збожжавыя прадукты, мяса і мясныя вырабы. У кожнай гміне былі свае базы скупкі, склады мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы раслін. У гмінных цэнтрах магазіны змяшчаліся ў адмыслова ўзведзеных будынках. Прапанавалі яны шырокі асартымент тавараў. Але ўжо вясковыя крамы працавалі ў прыватных хатах, найчасцей у адным памяшканні, без складской базы і праточнай вады. Гігіенічныя ўмовы ў іх былі скандальнымі. Інвестыцыйныя патрэбы ў вясковым гандлі былі вялікія — неабходна было пабудаваць новыя крамы і складскія збудаванні.



Канстанцін Майсеня з шафёрам Янам Лешчуком



Офіс Павятовага праўлення Гмінных кааператываў у пасёлку Гурнае ў Гайнаўцы (1965 г.)

Пасада старшыні Павятовага праўлення Гмінных кааператываў была тады ў наменклатуры Павятовага камітэта ПАРП. Ваяводскае праўленне Гмінных кааператываў прапанавала кандыдатуру, а камітэт разглядаў яе і канчаткова зацвярджаў. Перад гэтым мы праводзілі размовы з кандыдатамі. Падчас размовы Канстанцін Майсеня адчуваў сябе зусім свабодна, гаварыў талкова, з веданнем справы. Добра ведаў ён вясковае асяроддзе, а з людзьмі размаўляў на беларускай гаворцы. Не баяўся вырашаць складаныя пытанні. Меў ён вышэйшую эканамічную адукацыю. Быў чалавекам слова, умеў пераконваць людзей. Добра разбіраўся ў гаспадарчых і самаўрадавых справах, дасканала ведаў праблемы вясковага гандлю. Тады на вёсках актыўна дзейнічалі гурткі вясковых гаспадынь, якія ладзілі бясплатныя курсы крою і шыцця, кулінарыі, новых форм гаспадарання.

Папярэдніх размоў з кандыдатамі на пасаду старшыні ППГК правёў я многа, але Канстанцін Майсеня перавышаў усіх сваімі ведамі, рашучасцю і воляй дзеяння.

З вялікім задавальненнем паведаміў я Наглядальную раду ППГК у Гайнаўцы аб тым, што рэкамендую асобу Канстанціна Майсені як адзінага кандыдата на пасаду старшыні ППГК.

Пазней я сустрэўся ўжо са старшынёю ППГК Канстанцінам Майсенем, у якога ўжо былі свае напрацоўкі і дасягненні. Тады ён прадставіў мне дзве прапановы з просьбай падтрымаць іх. Першая датычыла пабудовы ў большых вёсках на грамадскіх пачатках магазінаў, другая — камасацыі грунтаў у тых вёсках, у якіх будзе стопрацэнтная згода ўсіх жыхароў. Прытым Майсеня дэталёва абгрунтаваў свае прапановы і прадставіў план іх рэалізацыі.



Жыхары вёскі давалі ўчастак пад будову крамы, працавалі пры будове, забяспечвалі гравій і пясок

Быў я вельмі здзіўлены гэтымі прапановамі, паколькі іх выкананне межавала з цудам. Рызыка была вялікая. Да таго камасацыя грунтаў не знаходзілася ў кампетэнцыі гмінных кааператываў.

Канстанцін Майсеня, як эканаміст, уяўляў сабе, што толькі ў такі спосаб павялічыць гандлёвы абарот кааператыва і яго даходы. Яго план меў на мэце паляпшэнне рэнтабельнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Сялянскія гаспадаркі ў Гайнаўскім павеце былі моцна раздробленыя, пераважная большасць якіх не перасягала 5 гектараў зямлі, а паасобныя гаспадары апрацоўвалі нават да 9 аддаленых ад сябе палосак — доўгіх вузкіх загонаў. У такіх умовах цяжка было весці рацыянальную гаспадарку. У выніку плён атрымліваўся вельмі ўбогі.

Па доўгай нарадзе з глаўбухам вырашылі мы падтрымаць Майсеневы прапановы. З боку Ваяводскага праўлення гмінных кааператываў гарантавалі мы інвестыцыйныя ліміты і фінансавыя сродкі, распрацавалі ў сваім праектным бюро праект тыповай вясковай крамы з выкарыстаннем гатовых панеляў, якія вырабляліся на заводах нашага цэнтра ў Варшаве. Абавязалі мы ўсе свае службы аказваць К. Майсеню дапамогу.

І Канстанцін Майсеня стаў будаваць вясковыя крамы з дапамогай насельніцтва. Жыхары кожнай вёскі давалі бясплатна ўчастак пад будову крамы, бясплатна працавалі пры будове, забяспечвалі гравій і пясок, давалі свой транспарт.

Рашэнне Майсені аказалася слушным. Магазіны ў вёсках раслі як грыбы пасля дажджу. Цэнтральная і лакальная прэса пісала, што Майсеня будуе харомы ў вёсках і ў гэтым не было лішняга перавелічэння, калі параўнаць умовы, у якіх працавалі вясковыя крамкі да гэтай пары.

З камасацыяй грунтаў Майсеня таксама справіўся. Папраўдзе ўдалося яму гэта зрабіць у некалькіх вёсках, бо адміністрацыя на шырокамаштабную камасацыю не дазволіла, паколькі гэта не было ў кампетэнцыі гмінных кааператываў.

Тадышні старшыня Цэнтральнага саюза кааператываў Тадэўш Янчык за выдатныя заслугі ўзнагародзіў Канстанціна Майсеню Кавалерскім крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы, паколькі гэта дзякуючы ягонай рашучасці, прафесіяналізму, веданню справы і асяроддзя ўзнікла сетка вясковых магазінаў на Гайнаўшчыне.

**Запісаў Віктар БУРА**
**Фота з архіва аўтара**

# Юбілей айца Сяргея Корха

У апошнюю нядзелю ліпеня г.г. у праваслаўным прыходзе ў Белавежы ўрачыста адзначылі двайны юбілей настаяцеля прыхода а. Сяргея Корха. Айцец Сяргей 30 гадоў назад, 25 чэрвеня 1979 г., прыняў духоўны сан і 9 ліпеня 1979 г. быў накіраваны ў Белавежскі прыход. Два месяцы пазней, дэкрэтам ад 6 верасня 1979 г., яму ўжо афіцыйна даручылі выконваць абавязкі настаяцеля прыхода. А. Сяргей замясціў а. Клаўдзія Пушкарскага, які сваю душпастырскую паслугу выконваў тут на працягу 40 гадоў. У а. Сяргея ёсць шанц „зраўняцца” з а. Клаўдзіем.

Айцец Сяргей Корх — ураджэнец сяла Вітава, што ў гміне Дубічы-Царкоўныя. Нарадзіўся ён 16 мая 1950 г. Праваслаўную духоўную семінарыю закончыў у 1968 г., а ў 1973 г. — Хрысціянскую тэалагічную акадэмію ў Варшаве са званнем магістра тэалогіі. Затым а. Сяргей быў выкладчыкам у Вышэйшай праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Яблачыне. У кастрычніку 1978 г. узяў шлюб з Вольгай Васілюк. Дачакаліся двух сыноў — Міхала і Марка.



Памятны здымак айца Сяргея і матушкі Вольгі з мітрапалітам Савам

У 1986 г. а. Сяргей быў узведзены ў сан протаіерэя. У 1990 г. Святы сінод епіскапаў узнагародзіў яго паліцай, а праз два гады — крыжам з упрыгажэннямі. 30 красавіка 1996 г. а. Сяргея назначылі намеснікам дэкана Гайнаўскай акругі. У 1998-2005 гг. выконваў абавязкі візітатара праваслаўнай рэлігіі ў Варшаўска-Бельскай епархіі. Пачынаючы з сакавіка 2004 г. а. Сяргей Корх чытае лекцыі ў Студыі псаломшчыкаў і регентаў у Гайнаўцы. 10 сакавіка г.г. Святы сабор епіскапаў ПАПЦ вырашыў узнагародзіць а. Сяргея мітрай — найвышэйшай узнагародай, прысвойванай духоўным Праваслаўнай царквы ў Польшчы.

Айцец Сяргей шмат чаго добрага зрабіў для прыхода ў Белавежы. Цяжка было б і пералічыць усе праведзеныя ім рамонты і абнаўленні абодвух белавежскіх храмаў, прыхадскога дома і іх наваколля. Гэта ўжо зусім іншы прыход, чым 30 гадоў таму назад. На кожным месцы відаць след рукі а. Сяргея. Шмат якія прыходы могуць пазайздросціць белавежцам такога руплівага настаяцеля.

Многае лета вам, ойча Сяргей!

**Пётр БАЙКО**

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

# Адкрытае Падляшша

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Архітэктура Падляшша, між іншым цэрквы, упісаныя ў маляўнічы пейзаж, ці падляшскія рэчкі, балоты, азёры і лясы ў розныя поры дня і года можна пабачыць на фатаграфічнай выстаўцы „Адкрытае Падляшша”. Ад канца ліпеня семдзесят вялікафарматных здымкаў прэзентуецца на сцяне агародаў беластоцкага палаца Браніцкіх (ад Акадэмічнай вуліцы). Арганізатарам выставы з’яўляецца Фонд імя князя Канстанціна Астрожскага.

— На выставе прэзентуем працы аўтараў шматлікіх выставак і альбомаў ды лаўрэатаў адкрытага конкурсу, накіраванага ўсім зацікаўленым, таксама і аматарам, — тлумачыла ў час вернісажу Анна Радзюкевіч, старшыня ўправы Фонду імя князя Канстаніцна Астрожскага. — На конкурс прыйшлі 253 працы. З іх ліку камісія выбрала семнаццаць. Выбар быў нялёгкі. Вельмі цешуся, што выстава з’яўляецца таксама рэкамендацыяй маладых талентаў, займаючыхся прамоцыяй красы Падляшскай зямлі. Прыгажосць гэтай зямлі — нескажоная краса чатырох нацыянальных паркаў, між іншым найбольшага — Белавежскага.

Намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна:



Віктар Волкаў на фоне сваіх прац

— Свайго не ведаеце, а хваліце чужое. Прыглядаемся гэтай выставе і думаем: дзе ж можа быць такая прыгажосць? Аказваецца, не за мяжою, а ў мясцовасцях Падляшша.

Адзначыў:

— Козырам гэтай выставы з’яўляецца тое, што выйшла яна з будынка. Яна на натуры і паказвае натуру.

Як адзначана ў каталогу, выдадзеным з нагоды выставы, яе мэтай з’яўляецца таксама „одум над сустручай Усходу з Захадам”, паколькі „гісторыю гэтай зямлі стваралі розныя народы: польскі, рускі, яўрэйскі, літоўскі, таксама татарскі”. Аўтарамі здымкаў з’яўляюцца людзі розных пакаленняў. Малады фатографік Адам Фалькоўскі прадставіў толькі адну працу, на якой відаць царкву ў Боцьках. Ён — католік, родам з Бельска-Падляшскага. У размове з „Нівай” патлумачыў што яго заінспіравала да выканання здымкаў якраз царквы:

— Я заўжды цікавіўся рэлігіяй і сакральнымі аб’ектамі, якіх мноства ў ваколіцах Бельска-Падляшскага, ва ўсёй Боцькаўскай гміне. Прыгожыя праваслаўныя крыжы і малыя, забытыя царкоўкі. Тыя старыя, малыя цэрквы з’яўляюцца сведчаннем таго, што праваслаўныя вернікі былі тут заўсёды і трэба гэта паказваць усёй Польшчы і па-за Польшчай.

На выстаўцы не магло не быць вядомых ужо майстроў гэтай галіны мастацтва: Артура Табара, Пятра Цеслі ці, урэшце, Пятра Савіцкага ды Віктара Волкава. У час вернісажу Віктар Волкаў прызнаўся ў размове з намі, што ягоную асаблівую ўвагу прыцягнуў адзін са здымкаў Артура Табара (жыхара Радама), які закрывае выставу: „Залатая рыбка”. На ёй — надосвітку малады чалавек у лодцы трымае ў руцэ сетку са злоўленай рыбай:

— Здымкі — адзіная магчымасць захаваць нашы краявіды. Усё навокал прападае ў шалёным тэмпе, асабліва хутка мяняецца якраз краявід.

Па-за фатаграфіяй, згаданай Віктарам Волкавым, нашу ўвагу прыцягнула таксама магічная ў кліматах, а выкананая Славамірам Стэмпнем праца, якая прадстаўляе краявід над Бобрай. Беларускія і праваслаўныя кліматы адлюстраваны на шматлікіх здымках. Можна паглядзець беларускі карагод у Нараўцы ці крыжы на Святой Гары Грабарцы і Супрасльскі манастыр з птушынага палёту.

Ідэя выставы нарадзілася паўтара года таму. Яе рэалізатарам быў Міраслаў Матрэнчык. Падрыхтавана яна была з нагоды 94-га Сусветнага кангрэса эсперанта. Будзе працягвацца да 15 верасня.

# Як Сакрат Яновіч трапіў у архіў

**З Ганнай ЗАПАРТЫКАЙ — дырэктарам Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, першай даследчыцай творчасці Сакрата Яновіча, госцем „Трыялогаў”, гутарыць Ганна КАНДРАЦЮК.**

*— Сакрат Яновіч не без прычыны ганарыцца тым, што як адзіны беларускі літаратар Беласточчыны ўжо „ляжыць” у архіве.*

— На жаль, пакуль ён адзін. Беласточчына — гэта ўнікальная з’ява ў гісторыі літаратуры і мастацтва. Тут можам гаварыць пра цэлую плеяду творцаў.

*— Як выглядаў шлях Сакрата Яновіча ў архіў?*

— Ініцыятарам перадаць сваю спадчыну ў архіў быў сам Сакрат Яновіч. Рыхтуючыся да даклада на „Трыялогах”, я падымала многія дакументы, у тым ліку і справу, якая фіксуе пачатак фондаў. Усё пачынаецца з 1981 года. Няма сведчанняў, што гэта да яго звярталася кіраўніцтва архіва і падштурхнула ідэю. Ёсць ліст, які сведчыць, што ідэя сварылася ім самім. Першая частка дакументаў збіралася дзесяць гадоў, таму што безупынна адбываліся нейкія падзеі ў жыцці пісьменніка, пісаліся творы, ён сам апрацоўваў рукапісы і аддаваў іх. А ў 2007 годзе я тут была і атрымала яшчэ вялікую частку дакументаў.




*— Ці на 1981 год архіў меў ужо прыватныя фонды паасобных пісьменнікаў?*

— Архіў працуе з 1960 года, на той час ён ужо меў за 200 фондаў пісьменнікаў БССР. На той час быў ужо архіў Янкі Брыля, Васіля Быкава, Максіма Танка, Алеся Адамовіча...

*— Якія цэнныя дакументы можа знайсці даследчык у фондах Яновіча?*

— На сёння фонд налічвае 9 тысяч дакументаў, ён амаль апрацаваны, мае навуковы вопіс. Што гэта значыць? Гэта значыць, што ён ужо адкрыты для тых, хто цікавіцца літаратурай, гісторыяй ці, канкрэтна, асобай Сакрата Яновіча. Тут маем дакументы і па гісторыі „Белавежы”, і па гісторыі Беларускага грамадска-культурнага таварыства, і па гісторыі „Нівы” і „Часопіса”, дакументы палітычнай дзейнасці. Вялікая частка дакументаў адносіцца да Вілы Сакрата, якой зараз споўнілася дзесяць гадоў.

*— Менавіта, як з перспектывы дзесяці гадоў выглядае архіўная частка Вілы Сакрата?*

— Вельмі грунтоўна. Па-першае — гэта агромністая перапіска, на сёння гэта звыш 2 тысячы лістоў, рукапісы, падрыхтоўка зборніка „Annus Albaruthenicus”, матэрыялы і карэктуры з праўкамі, паметкамі Сакрата Яновіча.

*— Які час, паводле архіваў, быў самы плённы для „Трыялогаў”?*

— Я б не вылучала нейкага перыяду. Можа самыя першыя гады, яны набіралі хады, набывалі свае абароты. Далей я сказала б, што інтэнсіўнасць працы не паніжаецца. У 2002 годзе яна набыла грунтоўны падмурак. Нас проста можа здзіўляць тое шырокае кола даследчыкаў, якія прыцягваліся да працы, тая колькасць матэрыялаў, якая падавалася ў зборнік.

*— Якія краіны найбольш адкрыліся на Беларусь?*

— Сёння можна сказаць, што гэта цэлая Еўропа. У нас карэспандэнцыя ад паўтысячы чалавек. Радуе таксама, што сярод іх даследчыкі і пісьменнікі з Беларусі.

*— У Рэспубліцы Беларусь няма цэнтра, які прамаваў бы беларускую культуру ў свеце.*

— Трэба прызнаць — няма. Мне часам сорамна, што такая вялікая справа робіцца адным чалавекам і яго паплечнікамі.

*— Ці вы адкрыты на іншых беларускіх літаратараў і мастакоў з Беласточчыны?*

— Вядома, Сакрат Яновіч павінен паслужыць як прыклад іншым, ён першы праклаў гэты шлях, па якім можна ісці. Зараз я павінна абдумаць для сябе праграму стварэння цэлай сістэмы асабістых архіваў у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Бо нягледзячы на тое, якім поўным не быў бы архіў Сакрата Яновіча, гэта прыватны архіў аднаго чалавека.

*— У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва працуе таксама фонд кампазітара Яна Тарасевіча з Саколкі.*

— Сапраўды, захоўваем агромністы архіў Яна Тарасевіча. Ён даследуецца і ўсё папаўняецца. Папоўнім яго апошнімі матэрыяламі з „Нівы”.

*Дзякую за размову.*

— Дзякую. Запрашаю вашых студэнтаў і даследчыкаў у наш архіў.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

# Незалежнасць не звалілася з неба

У Нью-Йорку 2 жніўня пасля нядзельнай царкоўнай службы ў грамадскай зале сабора св. Кірылы Тураўскага, што ў Брукліне, адбылася сустрэча Зянона Пазьняка і Сяргея Навумчыка з беларускай мясцовай грамадою. Выступоўцы расказалі прысутным пра гістарычныя падзеі, якія адбываліся напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў.





Зянон Пазьняк

Зянон Пазьняк распавёў шмат цікавейшых падрабязнасцей дзён, у якія тварылася навейшая гісторыя Беларусі. Калі да вырашальнай перамогі — абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту — прыводзілі як палітычна вывераныя дзеянні і разлік, так і разуменне псіхалогіі апанентаў прадстаўнікамі малакалькаснай апазіцыі Вярхоўнага Савета.



Сяргей Навумчык



Сяргей Навумчык развеяў міфы аб суверэнітэце, якія пануюць у беларускім грамадстве. Пра нібыта „зваліўшуюся з неба” незалежнасць (а пра дзесяткі тысяч загубленых жыццяў каліноўцаў, лістападаўцаў, людзей, якія загінулі падчас сусветных войнаў ды якіх забівалі энкавэдысты ў Курапатах, вы забыліся?), пра камуністаў „ініцыятараў праекта Дэкларацыі аб Суверэнітэце”, пра цэлы шэраг „змагароў за незалежнасць”, якія чамусьці пачалі з'яўляцца толькі ў апошнія гады, пра „вызначальную ролю заходніх краін” ды „вярхоўны дазвол Расеі” на беларускую незалежнасць. З дапамогай расповеду былога дэпутата, а зараз супрацоўніка „Радыё Свабода” Сяргея Навумчыка наведвальнікі сустрэчы змаглі зрабіць адпаведныя высновы.

...Шмат было ўжо сказана і напісана за амаль ужо два дзесяцігоддзі пра прыняцце Дэкларацыі аб Дзяржаўным Суверэнітэце 27 ліпеня 1990 года, пра абвяшчэнне 25 жніўня незалежнай краіны — Рэспублікі Беларусь, якая стала нашчадкам Вялікага Княства Літоўскага ды Беларускай Народнай Рэспублікі, пра нюансы галасавання па прыняццю бел-чырвона-белага нацыянальнага сцяга. Але ж расповед, як кажуць, з першых рук заўсёды дае тое пачуццё прысутнасці, ад якога час ад часу захоплівае дыханне, калі разумееш тую мізэрную мяжу, што аддзяляла поспех ад няўдачы.

Дух тых дзён быў выдатна перададзены выступоўцамі. Такія сустрэчы, дзе на жыццёвых прыкладах распавядаецца пра перамогі нацыянальнага духу, волі ды розуму над маргінальнасцю мышлення ды апантанасцю бяздушных выканаўцаў заўсёды прыдаюць дадатковай моцы. Нават у становішчы, калі, здаецца, ніякага выхаду папросту няма, дзякуючы падтрымцы адзін аднаго ды аб'яднанню канструктыўных людзей, думак ды сіл перамога можа быць дасягнута. Прыклад дзеянняў дэпутацкай групкі ад БНФ на пачатку 1990-х, якая мела толькі 8% галасоў у Вярхоўным Савеце, — лепшае таму пацвярджэнне.

**Дзяніс ТАЛПЕКА**




Аб прыватным музеі Анатоля Белага, што ў Старых Дарогах пад Мінскам „Ніва” ўжо пісала ў нумары ад 8 красавіка 2007 года. Сайт музея меў многа недахопаў. Выправіліся яны альбо не — няхай судзіць чытач, калі нябярэ на сваім камп'ютары адрас http://spadchina.narod.ru/. Мы ж сёння завітаем на сайт грамадскага культурна-асветнага клуба „Спадчына”, які ўзначальвае згаданы Анатоль Белы.

Сайт „Спадчыны” месціцца па адрасе http://spadchyna.org. Гэты надпіс аздабляе бел-чырвона-белы сцяжок, што прысутнічае і на выяўленні кожнай старонкі партала, які выглядае вельмі годна — светла-карычневае выяўленне з беларускімі сімваламі і назвай клуба, напісанай гатычным шрыфтам. Не абышлося без эпіграфа са слоў Францыска Скарыны, якія вельмі трапна характарызуюць памкненні сяброў „Спадчыны” — „тако ж и люди, и где зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають”.

Паколькі клуб і музей маюць арганічнае спалучэнне, то і на галоўнай старонцы распавядаецца пра музейную ўстанову, што ўзнікла, дзякуючы намаганням аднаго чалавека. Тут жа месціцца расповед пра выданне клуба — „Адраджэнцы Беларусі”, а таксама тэкст „Пакутнікі Беларусі”, прысвечаны памяці беларусаў, што сталі ахвярамі сталінскага рэжыму.

Як мае быць, з левага боку месцяцца выйсці да іншых старонак сайта. Іх даволі многа, і яны падзелены на тры часткі — „Клуб”, „Старасвецкая Беларусь” і „Галерэі”.

Каб пазнаёміцца з сябрамі клуба, ягонай дзейнасцю і гісторыяй, не трэба адмыслова ехаць у беларускую сталіцу. Поўная інфармацыя месціцца на такіх старонках, як „Сябры клуба”, „Музей”. У „Храналогіі клуба” даецца падрабязны расповед пра кожную важную дату ў жыцці „Спадчыны”.

Для кожнага, хто неабыякава ставіцца да гісторыі Беларусі і яе выбітных асоб, нялішне будзе зазірнуць на старонкі „Старасвецкай Беларусі”. Першая з іх — „Нашы вялікія прадзеды”, дзе змешчаны тэксты пра полацкіх князёў.

Рубрыка „Нацыянальны пантэон” прэзентуе выставу ў музеі Белага з партрэтаў слынных сыноў і дачок беларускай зямлі. „Тут цэлая галерэя партрэтаў выбітных асоб нашай сярэднявечнай дзяржавы, дзесяткі бюстаў, барэльефаў, — гаворыцца ў тэксце, напісаным адным з сябраў клуба Яўгенам Лаўрэлем. — Адных медалёў з выявамі знакамітых продкаў ад Усяслава Чарадзея і Еўфрасінні Полацкай і да знакавых постацяў нашага часу, такіх як Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў, Янка Брыль, Мікола Ермаловіч, Мікола Улашчык, блізу сямі сот”.

Адна з найбольш цікавых рубрык сайта — „Балады беларускага шляху”. Шэсць старонак розных балад, прысвечаных як падзеям, так і людзям, якія без перабольшання з'яўляюцца ўвасабленнем самой Беларусі.

Раздзел „Галерэі” — гэта своеасаблівы мастацкі музей, дзе месціцца вялікая калекцыя карцін і фотаздымкаў. Тут знаходзяцца як тэматычныя выставы, так і зборы мастацкіх твораў розных жанраў.

Знаёмства з сайтам заканчваецца добравядомай песняй „Спадчына” на словы Янкі Купалы, якая, відаць, ужо стала своеасаблівым гімнам аднайменнага краязнаўча-гістарычнага клуба.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**



## Беларусь, беларусы...

### „Пабітыя” кубкі

Паход беларускіх футбольных клубаў у чарговыя розыгрышы еўрапейскіх кубкаў скончыўся куды сумней, чым можна было б чакаць. Аніводзін з трох нашых прадстаўнікоў не здолеў прайсці бар'ер другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. Надзеі заўзятараў разбіліся як кубкі на кухні. І калі пралёт мінскага МТЗ у спаборы з данецкім „Металургам” быў вызначаны адразу пасля гасцявога паядынку (0:3), то на мінскае „Дынама” і наваполацкі „Нафтан” былі рэальныя спадзяванні. Але, але... Падначаленыя Юрыя Пунтуса і дома не здолелі набраць хоць бы ачко ў агульны залік. Пад праліўным дажджом на сталічным „Трактары” яны зноў прайгралі ўкраінцам — на гэты раз 1:2. Выступ „Дынама” ўвогуле скончыўся поўным канфузам. Згуляўшы дома 0:0 з нарвежскім „Трамсё”, у гасцях мінчукі лопнулі як мыльная бурбалка — 1:4. У выніку заканамернай адстаўкі сербскага настаўніка Славалюба Мусліна, які на беларускіх прасторах нічым моцным нікога не здзівіў. Дэбютант еўракубкаў „Нафтан” бадай быў найбліжэйшым з нашага трыо да выхаду ў трэці круг, але яму забракла досведу матчаў такога роўню. Выйграўшы на сваім полі 2:1 у бельгійскага „Гента”, у гасцях навапалачане саступілі 0:1 і па суме крыўдна выбылі з розыгрышу. Можа гэта і да лепшага, бо ў наступным раўндзе „Гент” быў бязлітасна біты тытулаванай „Ромай” з Італіі.

У такой сітуацыі ўсе спадзевы былі на барысаўскі БАТЭ ў кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў. Аднак прайсці трэці адборавы раўнд да асноўнай сеткі турніру наш флагман таксама не здолеў. На яго шляху стаў латвійскі „крэйсер” — „Вентспілс”. Непрыемная параза барысаўцаў у гасцях 0:1 пакідала рэальныя шанцы беларускаму чэмпіёну. Аднак хатні матч БАТЭ пачаў няўдала, першым прапусціўшы гол. Да гонару хлопцаў Віктара Ганчарэнкі яны не склалі рукі і былі блізкія да агульнага поспеху. Два галы Сяргея Крыўца прынеслі лакальную віктоpыю нашым — 2:1, але па суме за кошт мяча забітага на чужым полі верх узяў „Вентспілс”. Так што паўтарыць леташняе дасягненне БАТЭ не здолеў. Цяпер у якасці суцяшэння і чарговага шанцу яго чакае спатканне з балгарскай камандай „Літэкс” у стыкавым раўндзе Лігі Еўропы. Першы матч барысаўцы правядуць дома.

Адбыліся на мінулым тыдні і матчы 1/16 фіналу Кубка Беларусі. Іх агульным вынікам стала тое, што 3 з 14 клубаў вышэйшай лігі, якія ўсе на гэтай стадыі гулялі ў гасцях, выбылі з розыгрышу. Бабруйская „Белшына”, каманда 2-га дывізіёна, адолела брэсцкае „Дынама” — 1:0. „Віцебск” пасля 3:3 у асноўны час прайграў па пенальці малодшаму брату „Полацку” (Д2) — 2:3. Ну, а пройгрыш „Смаргоні” — безнадзейнага аўтсайдара айчыннай мацнейшай кагорты — ад гомельскага ДБК (Д2) — 0:2 ужо нікога не здзівіў. Астатнія сустрэчы прынеслі наступныя зыходы: „Спартак” (Шклоў, Д2) — „Верас” (Нясвіж, Д2) — 1:2; „Славія” (Мазыр, Д2) — „Хваля” (Пінск, Д2) — 2:0; „Гарадзея” (Д3) — „Днепр” (Магілёў) — 1:2; „Жлобін” (Д3) — „Нафтан” (Наваполацк) — 0:2; „Слуцкцукар” (Слуцк, Д3) — МТЗ-РІПА (Мінск) — 1:2; „Ведрыч-97” (Рэчыца, Д2) — „Граніт” (Мікашэвічы) — 2:5; „Белкард” (Гродна, Д2) — „Тарпеда” (Жодзіна) — 0:1; „Баранавічы” (Д2) — БАТЭ (Барысаў) — 0:4; „Зорка”-БДУ (Мінск, Д3) — „Дынама” (Мінск) — 1:7.

Цяпер асноўная ўвага беларускіх прыхільнікаў футбола будзе прыцягнута да адборавых матчаў чэмпіянату свету з удзелам нацыянальнай зборнай. Бліжэйшы — 12 жніўня ў Мінску з Харватыяй.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Тут такі патрыятычны дух

Што б не гаварыць, але народная культура, нягледзячы на розныя складанасці, жыве і развіваецца, а самым яркім сведчаннем таму, па-мойму, з'яўляецца беларускі фэст у Бандарах.

Чарговы ўжо год у бандарскім пасёлку гудзела „Бандароўская гасцёўня". Стаяла прыгожае надвор'е. Над пасёлкам у празрыста-блакітным небе кружылі чайкі з-над Семяноўскага вадасховішча. Менавіта ў такім антуражы 18 ліпеня пачаўся беларускі фэст у гонар 65-годдзя вызвалення нашай малой айчыны з-пад нямецкай акупацыі. Напачатку прагучала чуллівая песня „Мой Беластоцкі край" на словы ўраджэнца Бандароў Алеся Барскага, затым на сцэну выйшлі старшыня БГКТ Ян Сычэўскі, бурмістр Міхалова Марк Назарка і солтыс Бандароў Анна Марчук, якія прывіталі публіку і гасцей, у тым ліку консула Рэспублікі Беларусь Наталлю Міськевіч, айца архімандрыта Гаўрыіла са скіта ў Адрынках і рэктара Вышэйшай менеджарскай школы ў Беластоку Міхала Лісоўскага. Пасля афіцыйных выступленняў, прамоў і вітанняў справу ў свае рукі ўзяла Бася Кендысь з Гайнаўкі, якая на беларускай мове павяла ўсю праграму мерапрыемства.

— Шматлікія калектывы, якія адраджаюць і папулярызуюць наш фальклор, сталі для нашай публікі



Фота Віктара БУРЫ

сапраўднымі сябрамі, гонарам нашага свята, — сказала вядучая. — Хочацца адзначыць, што наш фэст — гэта не проста свята дзеля свята, але і адраджэнне нашых слаўных песень.

Пасля славутых „Цаглінак" са Старога Ляўкова выступілі „Арт-Пронар" з Нарвы, „Каласкі" з Беластока, „Калінка" з Гарадка і „Белы птах" з Мінска. Канцэрт надаў асаблівую афарбоўку мерапрыемству. Доўга ў гэты ясны летні дзень луналі, ліліся над бандарскімі прасторамі мілагучныя песні, чуўся радасны гоман людзей. Якая асалода для публікі пачуць і пабачыць на свае вушы і вочы выканаўцаў, якія па-майстэрску спяваюць родныя песні. Вядома, можна слухаць іх па радыё ці з запісаў, але нішто не замяніць акустычнага гучання на прасторнай пляцоўцы ў Бандарах. Кажуць, каб зразумець і палюбіць песню на беларускіх фэстах, трэба навучыцца іх слухаць. А я скажу, што не пашкодзіць і навучыцца іх спяваць.

Тое, што робяць для вёскі калектывы з беларускім рэпертуарам, вельмі нас духоўна ўзбагачае. І хаця мы іх бачым у тэлевізары, чуем па радыё, тым не менш заўсёды рады іх сустракаць на „Бандароўскай гасцёўні".

Калі заспяваў і зайграў мінскі „Белы птах", публіка аж ахнула... Такая прыгажосць! Гэтыя заслужаныя артысты — 6 дзяўчат і 1 хлопец — праслаўляюць беларускую культуру таксама па-за межамі Беларусі. Адарваныя месяцамі ад дома і сям'і, пераадольваючы сотні кіламетраў гастрольных дарог, трапляючы ў самыя аддаленыя куточкі, радуюць людзей шчырай песняй і гумарам. Сваім майстэрствам мінскі калектыў заваяваў сусветную вядомасць і ўсенародную славу.

— Нам пашанцавала прыняць удзел у „Бандароўскай гасцёўні" — святочным мерапрыемстве ў суседняй Польшчы, на Беласточчыне — малой айчыне мясцовых беларусаў, — сказалі мінскія артысты на развітанне. — Як дасць Бог, то за год ізноў сустрэнемся з вамі, бо тут мы адчуваем сябе як дома.

Таксама ўдзельнікі сёлетняй „Бандароўскай гасцёўні" спадзяюцца, што чарговыя фэсты таксама будуць цікавымі і запамінальнымі. Традыцыя надае адчуванне стабільнасці, спрыяе захаванню нацыянальнай тоеснасці. Яна — духовы прытулак, куды кожны чалавек мае патрэбу вярнуцца, як да бацькоўскай хаты, роднай мясціны.

— Тут такі патрыятычны дух, — гаварылі шматлікія ўдзельнікі „Бандароўскай гасцёўні".

І гэта праўда!

Пасля ўсе калектывы і госці былі запрошаны на супольны пачастунак над вадой Семяноўскага вадасховішча.

**Віктар БУРА**

# Крыжы ля Броўскай дарогі

Традыцыя ўстанаўлення праваслаўнага крыжа ля Броўскай дарогі выводзіцца з незапамятных часоў. Белавежскія старажылы свайго часу сцвярджалі, што на гэтым месцы даўным-даўно знаходзілася невялікая царква. Крыжы ставяць як памятку аб ёй. Проста гэта асвячонае месца.

З мясцовых аповедаў вядома, што непадалёку крыжоў, а раней — царквы, знаходзілася сяло Крыштапова. Заснавана яно было пры 25-моргавым фальварку, пра які ўпершыню ўпамінецца ў 1696 годзе. Сёння на месцы Крыштапова ўзніклі пасяленні Вайцяхоўка (спярша — Зладзеёўка) і Цэнтура. Крыштапова спалілі самі яго жыхары ў 1710 годзе дзеля знішчэння бацылаў чумы, якія былі зацягнуты ў сяло і давялі да смерці амаль усё тутэйшае насельніцтва. Нешматлікія ўцалелыя жыхары перасяліліся ў другое месца на Белавежскай паляне.

Сяло Крыштапова адбудавалася на зломе XVIII і XIX стагоддзяў (ведаем пра гэта м.інш. з устаноўчага акта царквы ў Белавежы з 1798 года). Пратрымалася яно да другой паловы XIX стагоддзя — жыхары сяла з-за неўраджайнасці апрацоўванай імі зямлі былі пераселены ў сяло Стачок на той жа самай Белавежскай паляне.


Фота Тамаша Няходы

Цяжка сказаць каторы гэта ўжо па чарзе крыж стаіць ля Броўскай дарогі. Драўніна — матэрыял нетрывалы і праз некалькі дзесяткаў год тая частка, якая знаходзіцца ў зямлі, падвяргаецца гніенню. Калі надземная частка крыжа застаецца яшчэ ў добрым стане, тады ніжнюю спарахнелую частку адрэзваюць і паўторна ўкопваюць крыж у зямлю. Такую працэдуру можна выканаць некалькі разоў. Калі ўжо крыж не падае надзеі на доўгае „жыццё", побач яго ставяць новы. Менавіта гэтак і ёсць зараз ля Броўскай дарогі. Новы і больш высокі крыж паставілі тут і пасвяцілі ў снежні 2004 года.

**Пётр БАЙКО**

# Адгаданка



1. аскетычная сяброўка царкоўнай абшчыны, 2. галоўны рэквізіт сталовай, 3. палітычная арганізацыя, якая выражае інтарэсы грамадскай групоўкі, 4. гучны, адрывісты вокліч, 5. безвалосае месца на галаве, 6. Ноева гара, 7. насычаны воданепранікальным рэчывам тоўсты кардон, які выкарыстоўваецца як дахавы і ізаляцыйны матэрыял, 8. сімвал матэматычнай невядомай, 9. доля, пай, частка, 10. дзіцяня каровы, 11. харчуецца, есць, 12. хімічны элемент н-р 22, 13. партнёр бабы, 14. вялікі амерыканскі горад у штаце Ілінойс, 15. кітайскі партовы горад на рацэ Янцзы вышэй Нанкіна, 16. Сяргей Прытыцкі або Леапольд Родзевіч.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 28 нумара**

Бой, „Гоман", дойна, лета, метан, Мехелен, пот, Рыга, хота.

Рашэнне: **Не той бедны, хто мае мала, але той, хто прагне многа.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
***Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.***

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

**Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

**Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 000 egz.

# Гайнаўскі рок-н-рол

**Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК**

Амаль пусты пляц перад сцэнай у гайнаўскім амфітэатры. Нервова бегаюць маладыя людзі з бэджамі „Арганізатар" і „Валанцёр", але нервы толькі іх аб'ядноўваюць.

— Штосьці ўрэшце дзеецца для маладых, — кажа ліцэіст Ігар, — дык падумаў: памагу!

Не толькі Ігар захацеў стаць часткай новага праекта, да якога падрыхтоўка пачалася многа месяцаў раней. Яго старэйшая сястра, хаця вучыцца ў Варшаве, ужо пару гадоў дапамагае і пры „Басовішчы", і пры мерапрыемствах, ладжаных Музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы. Працамі кіруюць два маладыя бацькі: Тамаш Ціханюк і Тамаш Анікіюк. Гэта проста ідэйныя хлопцы, закаханыя ў музыку рок і панк, якія ведаюць свае карані і адчуваюць сувязь з родным месцам — Гайнаўкай.

### Малы штуршок, значыць, штуршочак

За мінулыя гады права на адзіны сапраўдны рок-фестываль у нашым „беларускім" рэгіёне „ўзурпавала" сабе „Басовішча". Думаю, мала хто ўяўляў сабе, што ёсць патрэба і прастора на іншы рок-фестываль. Больш музычных падзей наогул па адным у рэгіёне. На фоне такіх гігантаў як „Przystanek Woodstock", „Open'er Festival" у Гдыні, „OFF Festival" у Мыславіцах ці „Eko Union of Rock" у Вэнгажэве наша „Басовішча" здаецца быць невялічкім па маштабе, а калі б глянуць на праграму, то пераважае ў ім беларуская музыка (лепш сказаць з Беларусі або з беларускім тэкстам). Такім чынам месца на чарговыя лакальныя музычныя мерапрыемствы напэўна ёсць, толькі трэба знайсці сваю ідэю, вызначыць слухачоў-прыхільнікаў (ці як падказвае медыйны бізнес — таргэт) і пасябраваць з багатымі фірмамі (чытай, бровар або банк), ці людзьмі. Лёгка? Не кожнаму. Адвагі хапіла маладым энергічным дзеячам. Не пабаяліся яны адказнасці і вырашылі знайсці давер'е ў мясцовых улад ды прадпрымальнікаў.

— У вас сапраўды доўгі спісак спонсараў, — шчыра здзіўляюся ў размове.

— Ён сапраўды доўгі, — смяецца Тамаш Ціханюк, — але гэта не абазначае, што ў нас шмат грошай. Спонсарскія сумы наогул былі вельмі невялікімі.

— Але колькасць фірм і людзей пра нешта сведчыць....

— Здаецца, ёсць заангажаванасць у людзей, якія нейкім чынам адчуваюць сябе адказнымі за развіццё Гайнаўкі.

Зарабляць сабе грошыкі і жыць у горадзе, які адстае ад іншых мясцовасцей з патэнцыялам было б крывадушнасцю, але гэты фестываль паказаў, што патрэбна ініцыятыва, каб і „магнаты" зварухнуліся. Гайнаўка ўжо гадамі жыве толькі конкурсам „Przebojem na antenę", які падаравала гораду Радыё Беласток. Пару фэстаў і памежных беларуска-польскіх мерапрыемстваў фальклорнага характару таксама недастаткова маладым людзям, якім няма месца крыху пабунтавацца, перажыць па-свойму. Ёсць аднак актыўныя дзеячы, якія будуць падтрымліваць запал і ахвоту маладых на новыя выклікі.









### Сямейны здымак

Уваходжу ў амфітэатр. Аднымі з першых, якія занялі месца на лавачках, з'яўляюцца Ала Грыц — „Гайнавянін 2007 года", Пётр Гаган — жывапісец, Мікалай Яноўскі — вядомы ў Гайнаўцы палітык ды гаспадар-селянін, які дафінансаваў таксама новы фэст. Згаданыя разам з Тамашамі-арганізатарамі актыўна дзейнічаюць у Таварыстве сяброў Гайнаўкі. Абменьваюцца безупынна энергіяй і супольна падтрымліваюць чарговыя думкі.

— Сардэчна вітаю ўсіх на першым фестывалі „Рокавіска" — адкрыла фестываль некалькігадовая Маня Ціханюк, дачушка Томка. Гэта, думаю, было сапраўды сімвалічнае, але і шчырае, сямейнае, так як і настрой у групе арганізатараў. Фестываль толькі што пачынае пісаць сваю гісторыю, а Маня толькі што і ад зямлі адрасла. Няхай супольна ствараюць будучыню новага мерапрыемства. Зразу за ёю голас узяў бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк — чалавек, які аддае ініцыятыву сапраўды закаханым у горад людзям.

— Значыцца, падтрымка ёсць і будзе, — пытаю з усмешкай бурмістра.

— Будзем старацца.

— Мы таксама, — дадае Тамаш. — Хочацца, каб і другі фестываль адбыўся.

### Рок-н-рол нас не выратуе?

Калі не, дык што? Альтэрнатыва? Гіп-гоп? Класічная музыка? Гайнавяне кажуць гэтаму „не" ды супраць усім і ўсяго 25 ліпеня зладзілі фестываль „Rockowisko". На гайнаўскую сцэну пасля шматлікіх гадоў вярнулася зорка панк-рока гурт „Фарбэн Лейрэ". Я сама яшчэ ў 1990-х гадах пабывала на іхнім канцэрце, таму ведаю, што для фанаў рока канцэрт такой зоркі ў гэтым месцы быў сімвалічным. На сцэне паявіўся таксама легендарны „Блакітны Насарог" — гэта ўжо ветэраны лакальнай сцэны, якія раз на нейкі час выплываюць, дзякуючы цікавым падзеям і канцэртам. Дарэчы, адзін з музыкаў гурту Кляўдыюш Борыс ахвотна стаў вядучым фестывалю.

На самым адкрыцці можа не было шмат народу, але вакол самыя вядомыя твары, не толькі з Гайнаўкі, але і з Нараўкі, Міхалова. Па дарозе ў Гайнаўку бачыла я таксама маладых рокменаў, якія галасавалі на шашы.

— Я сапраўды шчаслівы, што гулялі тут не толькі мясцовыя, але і людзі з Польшчы, — скромненька ганарыцца Тамаш. — Усе яны далі нам станоўчую ацэнку і кажуць, што праз год будуць напэўна. Гулялі, спявалі разам з гуртамі, крычалі „дзякуем" і „сто лят"! — успамінае Тамаш. Самыя вялікія эмоцыі выклікаў хіба гурт „Цэля н-р 3" (гурт з Грудзёндза, які пад назвай „Страта памяці" ўзнік яшчэ ў 1985 годзе — І. К.)

Мне асабіста жаль было толькі, што на такім шчырым рок-н-рольным канцэрце не хапіла беларускіх гуртоў. Жаль можа таму, што Томэк Ціханюк працуе ў беларускім музеі, неаднойчы выступаў са сваім гуртом „Veritas" і сам ладзіў у Гайнаўцы канцэрты беларускіх гуртоў.

— Мне вельмі хацелася, каб быў прынамсі адзін беларускі акцэнт, — тлумачыць арганізатар. — Не зважаючы на недахоп грошай, неяк дагаварыліся раней з „:Б:Н:" з Бярозы, але ў дзень фестывалю адзін з музыкаў прысягаў сваёй жонцы і не давялося ім даехаць да нас. Не было ўжо галавы шукаць альтэрнатыву. Тут нам таксама крыві напсавалі канкурсанты, бо ў дзень мерапрыемства аказалася, што чатыры гурты не даедуць, але думаю, што другія выступоўцы былі гэтым задаволены.

Рок-музыка ў Гайнаўцы мае свае доўгія традыцыі, бо панк тут, паводле ініцыятараў фестывалю, развіваўся паралельна з яго развіццём у свеце. Склалася шматгадовая традыцыя, таму ёсць да чаго вяртацца і чым ганарыцца.

— Мы налічылі каля 30 гуртоў, якія стварыліся ў Гайнаўцы. Некаторыя іграюць нават дваццаць гадоў, — дадае Тамаш.

Паводле арганізатараў і аховы гайнаўскі фестываль „Рокавіска" наведала 4 тысячы людзей, а ў адзін момант у амфітэатры пры музыцы гуляла 2,5 тысячы гледачоў. Гэта „Рокавіску" падае надзею на будучыню.

# 15.08 — 21.08

**(22.03. — 20.04.)** 15-20.08. — добры момант на рашэнні ў прафесійных і фінансавых справах, а таксама на задбанне аб творчы бок тваёй натуры. Можа трапіцца нагода зрабіць добры інтарэс, ды трэба будзе ў гэта крыху заінвеставаць. У час мяцежніцкага Урана (17-22.08.) прагучаць у твой адрас горкія папрокі; лепш не адплачвай гэтым самым.

**(21.04. — 21.05.)** На працы (з 15.08. аж да 25.08.) будзеш мець мабілізацыю да большага высілку, а гульня вартая свечкі! З 16-22.08. будзеш паводзіць сябе свабодна, а нават з нейкай дозай шаленства! Добра зробіць табе рух на свежым паветры, работа ў агародзе.

**(22.05. — 22.06.)** Сустрэчы са знаёмымі будуць мець больш сур'ёзны і практычны характар. 15-21.08. будзеш мець падтрымку ад кагось, хто разбіраецца ва ўсім; карыстайся яго парадамі і падказкамі. З 19.08. (да 24.08.) не рабі вялікіх пакупак, не фліртуй у падарожжы, не мяняй радыкальна свайго выгляду.

**(23.06. — 23.07.)** З 15.08. (да 24.08.) карысны час для фінансавых спраў і сужонства. 15-24. — найлепшы час на вяселлі, пара будзе моцная. Не мусіш турбавацца будучыняй. З 20.08. Венера будзе паддаваць цябе ўсялякім спакусам (не страць галавы на тое, што нявартa).

**(24.07. — 23.08.)** 15-19.08. будзеш спраўны фізічна і задаволены. Можаш стартаваць у кожным спаборніцтве; гарачы тэмперамент! Маладзік Месяца (20.08.) разбудзіць тваю ўяву і душу артыста. Можаш выйсці на сцэну!

**(24.08. — 23.09.)** 15-19.08. замест праядаць грошы, заўважыш іх сапраўднае значэнне — памнажанне! Інтэнсіўная разумовая праца прынясе табе фінансавыя прыбыткі. Твае пяць хвілін на працы — з 19.08. (да 28.08.): не пабаішся цяжкасцей — поспех маеш у кішэні!

**(24.09. — 23.10.)** Працавіты час з 15.08. аж да 24.08. Трапныя фінансавыя вырашэнні. Грошы, выдадзеныя ў гэты час, будуць удалай інвестыцыяй. А дом будзе выглядаць класна.

**(24.10. — 22.11.)** Ненайлепшыя стасункі з блізкімі. Выдаткі. Не шалей на дарозе ў час маладзіка Месяца (20.08.), бо чагось можаш не заўважыць; пільнуй дакументаў. З 21.08 (да 25.08.) развяжаш свае сардэчныя клопаты. Добры кантакт са старэйшымі асобамі.

**(23.11. — 22.12.)** Да 20.08. ты вельмі моцны. Можаш выбрацца за мяжу, перажыць там цікавую прыгоду. 20.08. зробіш на ўсіх вялікае ўражанне — блёснеш сапраўднымі ведамі і розумам. 15-16.08. можаш зрабіць штосьці шалёнае; падумай, ці варта.

**(23.12. — 20.01.)** З 15.08. (аж да 24.08.) будзеш удзельнічаць у сямейных урачыстасцях. Найбольш спраў аформіш паміж 15 і 20.08.; шмат высілку, ды будуць немалыя прыбыткі; будзеш ганарыцца. 14-18.08. можаш зрабіць непрадуманыя хады, трапіць у пастку; не абяцай таго, чаго не ўдасца табе зрэалізаваць.

**(21.01. — 19.02.)** Жыві сціпла, старайся не выдаваць грошай. 15-16.08. афармляй службовыя справы. З 20.08. (да 26.08.) будзеш шчаслівы, сваімі хадамі трапіш у дзесятку!

**(20.02. — 21.03.)** 15-20.08. перапоўніць цябе творчая энергія, а інтуіцыя паможа ў трапных выбарах. З 20.08. будзеш вельмі пазітыўна ставіцца да свету. 17-21.08. не мяшайся ў чужыя справы. 15-19.08. не абяцай нічога; твая развага можа ў гэты час цябе падвесці!

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960